Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

29 ЖНІЎНЯ 2017 г. АЎТОРАК №165 (28529)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Дызайнеры з Венеры, заказчыкі з Марса

СТАР. 5



Рэкі без арэнды

СТАР. 7–8



Сіла роду. І слабасць забыцця

СТАР. 13

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Альбіна ДАВІДОВІЧ, начальнік аддзела дашкольнай адукацыі Міністэрства адукацыі:**

*«Усе ўстановы дашкольнай і агульнай сярэдняй адукацыі да пачатку навучальнага года будуць укамплектаваны педагагічнымі кадрамі. Пытання з недахопам педагогаў у дашкольных установах не стаіць. У новым навучальным годзе па ўсёй краіне будзе функцыянаваць 3817 устаноў дашкольнай адукацыі. Яны прымуць 424,6 тысячы выхаванцаў. Дашкольную адукацыю атрымліваюць 95,9% дзяцей ва ўзросце 3—6 гадоў, ва ўзросце 1—6 гадоў — 75,5%. Усе дзеці 5-гадовага ўзросту будуць ахоплены падрыхтоўкай да навучання ў школе. Сёлета сістэма дашкольнай адукацыі чакае папаўнення 16 новымі садкамі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.08.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9240 | ▼ |
| Еўра | 2,2954 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0328 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0754 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Лекар старога храма



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Архітэктар і скульптар Мікалай МАЛІНОЎСКІ працуе на архітэктурнай рэстаўрацыі аднаго з найстаражытнейшых помнікаў беларускага дойлідства — Спаса-Праабражэнскай царквы ў жаночым манастыры ў Полацку. Працуе амаль дзесяць гадоў. Нароўні з рэстаўратарамі па манументальным роспісе Мікалай Іванавіч вывучае стан сцен і падмуркаў, даследуе кожную цагліну, кожную шчыліну, дае свае навуковыя абрунтаванні і парады, як пры неабходнасці замацаваць сучасны матэрыял, не пашкодзіўшы аўтэнтыку. Сам, уручную, «лечыць» храм XII стагоддзя. Праца рэстаўратараў працягваецца ўжо не першы год, і вынік яе ўжо відаць: большасць каштоўных фрэсак, якія бачыла сама прападобная Еўфрасіння Полацкая, адкрытыя для зацікаўленых позіркаў вернікаў і турыстаў.

■ Ёсць такая прафесія

## Талерка супу... праз акно

Жыццёвыя байкі прамысловых альпіністаў

**Яны ніколі не хадзілі ў горы, аднак прафесійна караскаюцца па сценах і дахах. Уцяпляюць, фарбуюць, мыюць фасады дамоў летам, збіваюць ледзяшы са стрэх узімку, а здараецца... і ратуюць людзей. Прамысловыя альпіністы працуюць, гадзінамі вісячы на абвязках каля сцен дамоў. Жыхары рэагуюць на іх па-рознаму: хтосьці праз акно талерку супу прапануе, а хтосьці ножыкам спрабуе вяроўку перарэзаць.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Рэакцыя жыхароў на будаўнічых альпіністаў можа быць і такой замілаванай.**

### ДЗЯДУЛЯ З ДУБАЛЬТОЎКАЙ І ГОЛАЯ ДЗЯЎЧЫНА

Штодзённую рызыку на вышыні хлопцы не ўспрымаюць як нешта асаблівае — для іх гэта звычайная праца, якая акрамя грошай прыносіць маральнае задавальненне. У кожнага свая вяроўка, абвязка, сядушка. Альпіністы, як і парашутысты, самі сочаць за станам уласнай амуніцыі. Перад пачаткам работы некалькі разоў пераправераць вузлы, бо ад іх моцы і правільнасці залежыць жыццё, асабліва калі пад табой 60 метраў паветра (вышыня 20-павярховіка).

— *Няважна, другі гэта паверх ці 20-ы. Перад табой проста сцяна, і ты робіш сваю працу,* — кажа **Дзмітрый КАЗІМІРСКІ, альпініст з 14-гадовым стажам.** — *Мы звыкліся да вышыні і ўспрымаем яе па прынцыпе «проста даўжэй спускацца». Аднак той, хто не баіцца, — дурань.*

СТАР. 4

■ Перспектыва

## «ВЫЛЕТ ДАЗВАЛЯЮ!»

У Брэсце спадзяюцца, што пасля рэканструкцыі ўзлётна-пасадачнай паласы аэрапорта гэта каманда будзе гучаць часцей

**Цяпер такое нават уявіць не проста: з Брэста ажыццяўляліся рэгулярныя авіяперэлёты ў Маскву, Адэсу, Сімферопаль, Запарожжа, Кіеў, Кішынёў, Мінск. Рэйсы на Маскву выконваліся некалькі разоў у суткі, штодзённымі былі вылеты ў Кіеў, Днепрапятроўск, Мінеральныя Воды. А ў 1991 годзе адкрылася самая працяглая лінія Аэрафлоту: Брэст—Чэлябінск—Новасібірск—Чыта—Уладзівасток.**

«Знайшла што ўспомніць!» — скажа прыдзірлівы чытач. — На пачатку 80-х гадоў была ўзведзена ўзлётная паласа і абсталяваны аэрадром каля вёскі Моталь. І толькі зараджэнне крызісу ў эканоміцы перашкодзіла наладзіць рэгулярныя рэйсы паміж сталіцай і адным з самых цікавых населеных пунктаў Палесся... І ўсё ж гісторыю варта згадаць у кантэксце Брэсцкай паветранай гавані. Першы аэрадром у Брэсце паявіўся ў 1901 годзе і быў ваенным аб'ектам, а ў 1945 годзе стаў аб'ектам грамадзянскай авіяцыі. Размяшчаўся ён у рысе цяперашняга горада, тое месца па-ранейшаму ў народзе называюць «старым аэрапортам».

СТАР. 5

# ВАЙНУ ПЕРАМАГАЕ ДАБРЫНЯ

**Учора ў Палацы Незалежнасці адбылося не зусім звычайнае мерапрыемства. Разам з высокай госцяй — міністрам сацыяльных пытанняў і працы Сірыі Рымай аль-Кадэры — да Прэзідэнта Беларусі завіталі дзеці з гэтай краіны, якія на працягу апошніх двух тыдняў адпачывалі і папраўлялі здароўе ў адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня» і аздараўленчым лагеры «Крынічка».**



Фота БЕЛТА.

Нядаўна айчынныя СМІ абляцела навіна пра тое, што беларускія хірургі выдалілі пухліну дзесяцігадовай сірыйскай дзяўчынцы. Рым Салем разам са сваімі таварышамі, якія ўчора пабывалі ў Палацы Незалежнасці, прыехала на аздараўленне ў Беларусь. Падчас медыцынскага абследавання ў яе выпадкова знайшлі анкалагічнае захворванне. Апекуны дзяўчынкі згадзіліся на лячэнне, і на мінулым тыдні яе паспяхова прааперыравалі.

У дзяцей, што прыйшлі ўчора на сустрэчу з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам, цяжкі лёс і горкія ўспаміны. У кагосьці на вайне загінуў бацька, у кагосьці забілі маці, нехта страціў абаіх бацькоў, а нехта да таго ж братоў і сясцёр... Паездка ў Беларусь стала для іх магчымасцю аздаравіцца як фізічна, так і духоўна.

Дзеткі расказалі Прэзідэнту, што проста ў захапленні ад Беларусі. Аляксандр Лукашэнка ў адказ запрасіў іх прыехаць у нашу краіну разам з сябрамі і ў наступным годзе. А ў будучыні яны могуць атрымаць адукацыю ў беларускіх ВНУ.

— Перадайце сірыйцам, што беларусы для іх — самыя лепшыя сябры, — сказаў Прэзідэнт, звяртаючыся да юных гасцей.

Рыма аль-Кадэры падзякавала за тую дапамогу, якую Беларусь аказала і аказвае яе краіне. Яна прызналася, што гэта яе пяты візіт у Беларусь. Але, па яе словах, ён адрозніваецца ад папярэдніх. Яе радуе, што дзецям з Сірыі спадабалася ў Беларусі. Міністр адзначыла, што вопыт Беларусі ў сацыяльнай сферы з'яўляецца «вельмі прыярытэтным і вельмі карысным». Так, многія з нашых напрацовак можна ўкараніць і ў Сірыі.

— Тут не патрэбны ніякія падзякі, мы ведаем, што такое вайна, — адзначыў беларускі лідар. — У нас яшчэ жывыя пакаленні, якія перажылі страшную Другую сусветную, Вялікую Айчынную вайну, памятаюць, як гінулі дзеці, старыя... Беларусь больш за любую іншую рэспубліку Савецкага Саюза пакутавала ў апошняй вайне. Я зыходжу са звычайнай чалавечай ісціны: калі ты адгукаешся на нечае гора, то, не дай бог з табой гэта здарыцца, гэтаксама і табе дапамогуць. Ну а дзеці — гэта святое.

Прэзідэнт прапанаваў і на наступны год падумаць пра падобную праграму падтрымкі дзетак з Сірыі ў Беларусі. Міністр запэўніла, што асабіста зоймецца складаннем гэтай праграмы. Яна таксама звярнула ўвагу, што ў Сірыі і Беларусі ёсць магчымасці развіваць двухбаковае супрацоўніцтва — у тым ліку ў гандлёва-эканамічнай сферы.

На развітанне дзеці гучна праскандавалі: «Дзякуй». А адна з дзяўчатак як сведчанне таго, што Беларусь ёй вельмі-вельмі спадабалася, прачытала радкі з Якуба Коласа «Мой родны кут, як ты мне мілы...» Прэзідэнт узяў з яе абяцанне вярнуцца на наступны год у Беларусь і расказаць гэты ўрывак цалкам.

Пасля, разважляючы з журналістамі, дзеці расказалі пра свае лёсы. Сціскаецца сэрца ад таго, што яны перажылі гэта сёння — у XXI стагоддзі...

«...Мяне завуць Рахаф Салем Салема, я нарадзілася ў горадзе Латакія ў 2004 годзе. Я сірата. Мае маці і бацька загінулі, таксама загінулі мой брат і мая сястра. На працягу дзесяці месяцаў я была ў палоне ў ІДІЛ. Калі мяне вызвалілі, я стала жыць з цёткай... Вельмі хацела б прыехаць сюды яшчэ і ўвогуле я люблю падарожнічаць».

«...Мяне завуць Багдждад Ал Хурэ, я родам з Дамаска, таксама нарадзіўся ў 2004 годзе. Мая маці памерла ад хваробы».

Усе дзеці прызналіся, што вельмі ўдзячныя беларускаму Прэзідэнту за той час, які яны правялі ў Беларусі. Трэба сказаць, што наведалі яны нашу краіну і змаглі паправіць здароўе дзякуючы распараджэнню кіраўніка нашай дзяржавы. Дзеткі расказалі, што ў лагеры беларускія равеснікі ставіліся да іх вельмі прыязна. Будзем спадзявацца, што і ў наступным годзе юныя госці з Сірыі зноў змогуць да нас прыехаць.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

# РЭАЛІЗАЦЫЯ ДАМОЎЛЕНАСЦЯЎ

## Прэзідэнт сустрэўся з міністрам замежных спраў Егіпта

**Кіраўнік нашай дзяржавы двойчы наведваў гэту краіну: у чэрвені 1998-га і ў студзені бягучага года. Асабліва плённым атрымаўся апошні візіт — двухбаковыя стасункі істотна актывізаваліся. Так, сёлета Егіпет наведалі беларускія міністры прамысловасці, сельскай гаспадаркі і харчавання, прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя нашай краіны. Беларусь наведалі міністр гандлю і прамысловасці, міністр транспарту, дзяржаўны міністр ваеннай прамысловасці Егіпта. Учора ў Палацы Незалежнасці адбылася сустрэча Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і міністра замежных спраў Егіпта Самеха Хасана Шукры.**

— Я вельмі добра памятаю апошнія перагаворы ў Каіры з маім калегам, з найвышэйшымі службовымі асобамі, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта быў вельмі добры і, як я спадзяюся, вельмі паспяховы візіт. Мы тады пра многае дамовіліся з Прэзідэнтам Егіпта. Ваш візіт вельмі важны і значны, таму што ён дазваляе не забывацца пра нашы дамоўленасці. Візіты высокага ўзроўню членаў урада — ці беларускіх у Егіпет, ці егіпецкіх у Беларусь — многа значаць у плане рэалізацыі дамоўленасцяў, якіх мы дасягнулі тады ў студзені падчас перагавораў.

Беларусь і Егіпет могуць быць карысныя адно для аднаго. Так, нашы прадпрыемствы могуць рэалізаваць у гэтай паўночнаафрыканскай краіне праекты, скіраваныя на развіццё яе эканомікі.

— Мне падалося, што Беларусь будзе дастаткова запатрабавана ў эканамічным росце, у развіцці Егіпта, — заўважыў беларускі лідар. — Яшчэ раз хачу пацвердзіць: мы зробім усё, пра што дамаўляліся. Усё будзе залежаць ад вас, егіпцян: наколькі хутка мы можам развярнуцца.

Самех Хасан Шукры — першы міністр замежных спраў Егіпта, які наведвае Беларусь. Ён прызнаўся, што для яго гэта вялікі гонар і прывілея. Трэба сказаць, што візіт егіпецкага дыпламата разглядаецца ў тым ліку і ў якасці падрыхтоўчага этапу для правядзення афіцыйнага візіту Прэзідэнта Егіпта Абдэля Фатаха Ас-Сісі ў нашу дзяржаву.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

## ■ Блізкая ўлада

# Больш за ўсё пытанняў у дачнікаў

### Што хвалюе жыхароў Бабруйскага раёна?



**Традыцыйную прамую тэлефонную лінію ў суботу, 26 жніўня, у Бабруйскім райвыканкаме правёў старшыня раённага Савета дэпутатаў Аляксандр ЕМЯЛЬЯНАЎ, на гэтым дыялогу папрысутнічала і карэспандэнт «Звязды», каб даведацца пра вострыя праблемы рэгіёна.**

На гадзінніку 9.00, Аляксандр Іванавіч гатовы да адкрытай размовы, мы таксама ў чаканні цікавых пытанняў, аднак прадстаўнік улады папярэджвае: «Званкоў сёння будзе не шмат — гарачая пара, усе на агародах». Ён тлумачыць, што звычайна на «суботні тэлефон» паступае каля 5—10 зваротаў, сёння нам пашанцуе, калі будзе хоць бы 1—2 званкі.

Цяперашняе лета выдалася спакойным, а вось у мінулыя гады, успамінае Аляксандр Іванавіч, самым галоўным пытаннем быў недахоп вады. «Засушлівае лета, мала дажджоў, таму ўзнікалі праблемы. У некаторыя населеныя пункты і садовыя таварыствы ваду прыходзілася проста падвозіць. Сёлета такой праблемы няма, але ёсць іншая — якасць вады. У раёне неабходна пабудаваць станцыю абезжалезвання», — расказвае старшыня.

Наогул, самая «гарачая» пара для зваротаў — восень і вясна. Для кастрычніка — лістапада, напрыклад, найбольш актуальнае пытанне — ацяпленне, а вясной у людзей пераважна ўзнікаюць пытанні па ЖКГ. Ёсць і круглагадовыя праблемы, у асноўным яны дробныя і вырашаюцца хутка.

*— У нас у раёне 213 населеных пунктаў, недзе не заўсёды своечасова прыходзіць аўтакрама, кудысьці могуць не давезці патрэбныя тавары. Пераважная большасць пытанняў — жыццёвыя: закрыўся прамтаварны магазін, людзі цікавяцца чаму, расказваем пра маленькі тавараабарот. У некаторых вёсках няма цырульніка, тлумачым чаму. Пытанне ўжо на парадак больш сур'ёзнае — дарогі. Натуральна, і вырашаюцца яно не так хутка,* — кажа Аляксандр Емяльянаў. *— У нас у раёне 79 дачных таварыстваў, 9 тысяч домаўладанняў, 2500 з іх выкарыстоўваюцца як дачныя домікі. У большасці дачнікаў ёсць машыны, цяпер гэта не раскоша. Дарогі, вядома, не ўсюды асфальтаваныя, таму ўзнікаюць пытанні.*

Яшчэ адна актуальная зараз тэма — старт вучэбнага года.

*— Напярэдадні яго ў нас прайшлі шматлікія акцыі, накіраваныя на дапамогу шматдзетным сем'ям. Усюды арганізаваны падвоз дзяцей да школ. Падрыхтаваны як школы, так і дзіцячыя садкі, месцаў усюды хапае. Праблема ў нас у іншым — падае нараджальнасць, з 2000 года колькасць дзяцей паменшылася больш чым у два разы,* — расказвае старшыня Савета дэпутатаў.

Яшчэ адна жывая для грамадства тэма — працаўладкаванне. Многія жыхары блізкіх да Бабруйска населеных пунктаў аддаюць перавагу таму, каб працаваць у горадзе. Бо на тэрыторыі раёна ўсяго адзін завод — па перапрацоўцы рапсу, усё астатняе — сельгаспрадпрыемствы. Таму пытанні па працаўладкаванні ўзнікаюць, як і паўсюль. Для іх вырашэння створана спецыяльная камісія.

Аляксандр Іванавіч адзначае, што бесперапынныя зносіны з грамадзянамі ў Бабруйскім раёне — ужо выпрацаваная сістэма, штомесяц праходзяць выязныя сустрэчы з насельніцтвам у сельскіх Саветах, на тэрыторыі раёна іх 11. На сустрэчу выязджаюць прадстаўнікі ўсіх службаў: ЖКГ, МНС, дарожнікі. Кожны трэці чацвер месяца праходзяць дні інфармавання на прадпрыемствах і ў арганізацыях.

Такая сувязь жыхароў раёна з прадстаўнікамі ўлады прыносіць свой плён штотыдзень, усё часцей паступаюць званкі падзякі, з добрымі словамі людзі звяртаюцца нават і ў газету.

Ну а ў гэтую суботу, як і чакалася, на прамую лінію паступіў толькі адзін званок, жыхар раёна ўступіў у спрэчку з работадаўцам, які адмаўляецца працягваць кантракт, не тлумачачы прычын. Аляксандр Іванавіч паабяцаў разабрацца ў сітуацыі з дапамогай афіцыйнага запыту.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*
*г. Бабруйск*

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## На ЗША абрынуўся наймагутнейшы за 12 гадоў ураган «Харві»

На піку сваёй моцы ён ударыў па штаце Тэхас, аднак пачаў імкліва слабець: чацвёрты ўзровень небяспекі быў паступова паніжаны да першага. Тым не менш стыхійнае бедства паспела нанесці адчувальны ўрон, выклікаўшы маштабную паводку. Загінулі сем чалавек, вуліцы многіх гарадоў затоплены практычна да ўзроўню дахаў дамоў, адменены сотні авіярэйсаў. Як заўважыў губернатар штата Грэг Эбат, у гарадах Х'юстан і Корпус-Крысці ўжо выпала па 50 см ападкаў і яшчэ можа выпасці да 40 см. Паводле ацэнак экспертаў кампаніі CoreLogic, на аднаўленчыя работы ўладам прыйдзецца выдаткаваць ад 17 да 40 мільярдаў долараў.

## Індыя і Кітай узгаднілі развядзенне войскаў у раёне спрэчнага плато ў Гімалаях

Індыя і Кітай дамовіліся пра паскоранае развядзенне войскаў у раёне плато Доклам пасля больш як двух месяцаў супрацьстаяння, якое магло скончыцца ўзброеным канфліктам паміж краінамі. Адпаведныя дамоўленасці былі дасягнуты падчас перагавораў, паведаміла МЗС Індыі. Нагадаем, у сярэдзіне жніўня індыйскія і кітайскія ваенныя абвясцілі аб падрыхтоўцы да магчымага ўзброенага канфлікту з-за плато ў Гімалаях. З-за гэтай стратэгічна важнай тэрыторыі, дзе сустракаюцца межы Кітая, Тыбета, Індыі і Бутана, бакі ваявалі ў 1962 годзе. Супрацьстаянне абвастрылася два месяцы таму, калі кітайскія ваенныя інжынеры пачалі падрыхтоўку да будаўніцтва горнай дарогі на ўчастку плато. Індыйскія войскі ўступілі ў сутыкненне з імі.

## Паўстанцы FARC стварылі партыю



Левper радыкальная калумбійская групоўка FARC (Рэвалюцыйныя ўзброеныя сілы Калумбіі) стварыла сваю палітычную партыю. Аб гэтым абвясцілі на канферэнцыі ў Калумбіі прадстаўнікі былых паўстанцаў-марксістаў, якія на працягу 52 гадоў вялі ўзброеную барацьбу супраць улад. З назвай партыі яны пакуль не вызначыліся, але праграма, з якой пойдуць на выбары налета, ужо распрацоўваецца. «Рэжым і сістэма створаны не для нас, але мы ўліваемся ў іх з жаданнем дадаць свае змяненні», — адзначыў лідар FARC Радрыга Ландоньа, шырока вядомы як «Цімашэнка».

**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне начальніку ўпраўлення выдавецкай дзейнасці і гандлю Паўлавай Алене Савельеўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ Паўлава Савелія Яфімавіча.**

**Калектыў УП «Мастацкая літаратура» выказвае шчырыя спачуванні начальніку ўпраўлення выдавецкай дзейнасці і кніжнага гандлю Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь Алене Савельеўне Паўлавай з выпадку напаткаўшага яе вялікага гора — смерці БАЦЬКІ, вядомага пісьменніка Савелія Паўлава.**

**Калектыў Выдавецкага дома «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні начальніку ўпраўлення выдавецкай дзейнасці і гандлю Міністэрства інфармацыі Алене Савельеўне Паўлавай з нагоды напаткаўшага яе вялікага гора — смерці БАЦЬКІ.**

# СВЯТА СПОРТУ І АДУКАЦЫІ

## Рэкордная колькасць удзельнікаў сабралася на фестывалі «Алімпія-2017»

**Аб гэтым заявіў сакратар ЦК БРСМ, каардынатар праекта Дзмітрый ТУРОНАК. Ва ўжо традыцыйным мерапрыемстве для працуючай моладзі, якое прайшло з 25 па 27 жніўня, прыняло ўдзел больш за 800 чалавек. Гэта дваццаць спартыўных камандаў, эксперты ў розных галінах, а таксама госці фестывалю. Удзельнікі сабраліся на беразе маляўнічай ракі Іслач у Валожынскім раёне, каб паспрабаваць свае сілы ў розных спартыўных спаборніцтвах, а таксама наведаць адукацыйныя пляцоўкі.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Удзельнікі фестывалю паспаборнічалі ў футболе, баскетболе, перацягванні каната, дартсе, гіравым спорце, пешаходным турызме, а таксама ўпершыню — у экстрым-сплаве на байдарках. Няглядзячы на шырокі спартыўны складнік, цэнтральнае месца ў фестывалі было адведзена адукацыйнаму блоку. Акцэнт быў зроблены менавіта на навучанні маладых людзей, чаму спрыялі розныя трэнінгі, сесіі, майстар-класы і інтэлектуальныя турніры.

Урачыстае адкрыццё адбылося пры ўдзеле міністра інфармацыі Ліліі Ананіч, старшыні Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзіі Ярмошынай, членаў Савета Рэспублікі, а таксама першага сакратара ЦК БРСМ Андрэя Белякова.

— Маладосць — гэта не толькі ўзрост, але і тое, што чалавек нясе ў сваім сэрцы. Таму ўсе, хто прыязджае на гэты фестываль, — гэта людзі, маладыя сваімі справамі і памкненнямі, — сказала **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ**. — Я лічу, што рэалізавацца ў жыцці можна толькі тады, калі актыўна працуеш у соцыуме. Калі працуеш і на сябе, і на краіну — толькі тады ўсё атрымаецца.

На адкрыцці фестывалю да маладых людзей звярнулася і **старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія ЯРМОШЫНА**. «Тут як быццам існуе свой мікраклімат, тут заўсёды цёпла. Я думаю, што энергія тых маладых сэрцаў, якія прыехалі сюды, разганяе хмары над Валожынскім раёнам і стварае цудоўную атмасферу, — з упэўненасцю заявіла Лідзія Ярмошына. — БРСМ за названы перыяд змог эфектыўна асвоіць нішу маладзёжных грамадскіх арганізацый».

Адразу пасля заканчэння афіцыйнай цырымоніі адкрыцця адбылася галоўная адукацыйная падзея мерапрыемства — адкрыты дыялог запрошаных экспертаў і ўдзельнікаў «Алімпіі-2017» на тэму «Бітва за моладзь: паміж інфармацыяй і прапагандай».

Падчас дыялогу міністр інфармацыі Лілія Ананіч адзначыла, што жыхары нашай краіны сталі больш выбарачна ставіцца да інфармацыі ў інтэрнэце. Этап насычэння ў перспектыве абавязкова зменіцца этапам асэнсавання. «Навошта патрэбен інтэрнэт? Што карыстальнік хоча там атрымаць? Вы хутчэй прафесійную інфармацыю, знайсці сяброў, абмяняцца меркаваннем? Сёння ў грамадстве і дзяржаве ідуць глыбокія працэсы асэнсавання ролі і значэння інтэрнэт-тэхналогій у развіцці інфармацыйнай сферы», — падкрэсліла міністр. Лілія Ананіч таксама дадала, што сёння Міністэрства інфармацыі аналізуе міжнародны вопыт і бачыць неабходнасць удасканальваць заканадаўства ў сферы інтэрнэт-інфармавання.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

■ Надвор'е

# Цяпло яшчэ вернецца

**Умерана цёплае і без ападкаў надвор'е чакаецца ў Беларусі на гэтым тыдні, паведамляе начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**

У апошнія дні лета і на старце восені чакаецца спакойнае і ўмерана цёплае надвор'е, лічыць эксперт. Цыклон, які прынёс пахмурнае, дажджлівае і ветранае надвор'е, пакідае нашу краіну. Яго месца зойме антыцыклон, які і будзе вызначаць сітуацыю ў працоўныя дні. Сіноптыкі падлічылі, што з аўторка па пятніцу ў Беларусі будзе пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай у асобных раёнах краіны чакаецца туман. У сераду дзённая тэмпература пачне павялічвацца, а ўначы будзе халаднавата — толькі плюс 5—11 градусаў, удзень — 17—24 цяпла. У чацвер стане яшчэ цяплей: удзень чакаецца 19—26 цяпла, па паўднёвым захадзе — да плюс 28.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*




# На Віцебшчыне жнуць выбарачна

**Бітва з непагаддзю за ўраджай працягваецца. Павольна, але дакладна айчынныя аграрыі адваёўваюць апошнія тоны збожжа. Паводле аператыўнай інфармацыі Мінсельгасхарча на 28 жніўня, у краіне ўбралі збожжа з 94,1% пасяўных плошчаў і сабралі 7249,5 тысячы тон хлеба. Сярэдняя ўраджайнасць склала 35,8 ц/га.**

Асноўная работа па ўборцы зараз адбываецца ў паўночным рэгіёне краіны. У Віцебскай вобласці ўбрана 72,8% пасяўных плошчаў і намалочана 764,9 тысячы тон збожжавых і зернебабовых культур. Усе раёны Віцебшчыны ў нядзелю аднавілі ход уборачнай кампаніі. Паводле інфармацыі камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Віцебскага аблвыканкама, аграрыі ўбіраюць хлеб з палёў выбарачна. За дзень яны змаглі прайсці 6,2 тысячы га — каля 2% плошчаў. У выпадку захавання сухога надвор'я Чашніцкі, Глыбоцкі, Бешанковіцкі раёны змогуць завяршыць уборку да канца тыдня. Варта адзначыць, што ў большасці раёнаў збожжавыя і зернебабовыя ўжо ўбралі з 60—70% пасяўных плошчаў. Самыя высокія намалоты адзначаюцца ў Аршанскім, Верхнядзвінскім і Дубровенскім раёнах.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

■ Звяздоўцы

# ЭКСКУРС У МІНУЛАЕ,

## або Як мы ведаем гісторыю сваёй газеты

**Векавы юбілей газета «Звязда» адсвяткавала ўжо як некалькі тыдняў таму. А мы па-ранейшаму працягваем прымаць віншаванні. У якасці падарунка калектыву газеты «Звязда» Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны распрацаваў тэматычны квэст.**



Дзве каманды, створаныя з творчых работнікаў нашага калектыву, праходзілі заданне за заданнем — паказваючы гэтым самым, наколькі мы самі ведаем гісторыю сваёй газеты. Акрамя таго, аўтары квэсту — навуковыя супрацоўнікі музея Ірына Захаро і Кацярына Навіцкая — падрыхтавалі для дасведчаных звяздоўцаў і пытанні па экспазіцыі. Такім чынам, у тых, хто дагэтуль не быў у адноўленым музеі, з'явілася магчымасць пазнаёміцца з ім акурат падчас гульні.



Фота Надзеі БУЖАН.

Пасля таго як квэст быў паспяхова пройдзены (каманды набралі аднолькавую колькасць балаў, таму перамогу падзялілі пароўну), супрацоўнікі музея прапанавалі звяздоўцам запоўніць нумар газеты, які выйшаў акурат 75 гадоў таму. Вядома, той жнівеньскі нумар падпольнай «Звязды» паўтарыць ім не ўдалося. Але было што сказаць і сучаснаму пакаленню журналістаў, якія ашчадна захоўваюць памяць пра сваіх папярэднікаў.

Дарэчы, паўдзельнічаць у квэсце цяпер змогуць усе ахвотныя. Для гэтага трэба сабраць дзве каманды, набыць білет кожнаму ўдзельніку ў Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, а таксама заказаць квэст па тэлефоне 287 18 31.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

*Як звяздоўцы праходзілі квэст, можаце ўбачыць яшчэ і на відэа, змешчаным на нашым сайце (zviazda.by).*

■ На слыху

## Мядзведзь загінуў... пад коламі аўто

**У Бялыніцкім раёне невядомы аўтамабіль насмерць збіў дарослага мядзведзя вагой каля 150 кілаграмаў. Кіроўца з месца ДТЗ уцёк.**

Збітую жывёлу знайшлі ў чатыры гадзіны раніцы супрацоўнікі Бялыніцкай ДАІ на трасе Мінск — Магілёў каля вёскі Карытніца. Туша мядзведзя ляжала на праезнай частцы. Мяркуецца, што яго збіў грузавік, пасля чаго нейкі час цягнуў за сабой па асфальце: уся спіна ў жывёлы абадраная да пазваночніка і рэбраў. ДАІ шукае кіроўцу, які збіў мядзведзя. Пасля сутыкнення сляды ДТЗ павінны былі застацца на транспартным сродку. Відавочцаў ДТЗ просяць тэлефанаваць па тэлефоне 102. Тушу жывёлы перадалі для ўтылізацыі. Па словах спецыялістаў, ёй было тры-чатыры гады. Шкода навакольнаму асяроддзю ад гібелі чырванакніжніка ацэнена ў 400 базавых велічынь.

Дарэчы, днямі з'явілася інфармацыя пра нашэсце мядзведзяў на Віцебшчыне. Драпежнікі прыходзяць з расійскіх лясоў і трымаюць у страху вяскоўцаў.

## Выкінуў сабаку з пятага паверха

**Супрацоўнікамі Фрунзенскага РУУС сталіцы затрыманы 28-гадовы мінчанін, які падазраецца ў жорсткім абыходжанні з сабакам, якое прывяло да смерці жывёлы.**

У суботу каля поўдня ў міліцыю патэлефанавалі грамадзяне і паведамілі, што невядомы з акна пятага паверха дома па вуліцы Скрыпнікава выкінуў сабаку. Ад атрыманых траўмаў жывёла памерла на месцы. Міліцыянеры ўстанавілі, што ў кватэры знаходзіліся трое: гаспадыня і двое яе знаёмых, якія распівалі спіртныя напоі. Прычынай такога жорсткага ўчынку стала тое, што сабака справіў свае патрэбы на падлогу.

У дачыненні да затрыманага мужчыны распачата крымінальная справа па артыкуле 339-1 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь («Жорсткае абыходжанне з жывёламі»). Раней грамадзянін прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за махлярства.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Кошт ведаў

## Самыя дарагія падручнікі — у сямікласнікаў

**Міністэрства адукацыі агучыла новыя цэны на школьныя падручнікі і вучэбныя дапаможнікі ў 2017/2018 навучальным годзе.**

Так, кошт поўнага камплекта з 11 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для першага класа складае Br16,49, для другога класа (11 падручнікаў) — Br19,52, для трэцяга класа (13 падручнікаў) — Br21,96, для чацвёртага класа (12 падручнікаў) — Br13,4, для пятага класа (16 падручнікаў) — Br24,02, для шостага класа (13 падручнікаў) — Br26,64, для сёмага класа (14 падручнікаў) — Br40,57, для восьмага класа (14 падручнікаў) — Br17,59, для дзявятага класа (16 падручнікаў) — Br16,06, для дзясятага класа (15 падручнікаў) — Br22,17 і для адзінаццатага класа (16 падручнікаў) — Br 27,97.

Трэба зазначыць, што ў параўнанні з папярэднім годам адбылося даволі істотны рост кошту падручнікаў. Самыя дарагія будуць у сямікласнікаў, што звязана з поўным абнаўленнем лінейкі падручнікаў для школьнікаў гэтага ўзросту. Але, як і ў папярэднія гады, бацькі будуць аплачваць толькі 50% ад кошту камплекта падручнікаў, гэта значыць, што згаданыя вышэй лічбы трэба падзяліць на два.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

# ПАСЛУХАЛІ КАНЦЭРТ І СЕЛІ НА ВЕЛАСІПЕД

## Як Аўгустоўскі канал стаў не толькі культурнай, але і спартыўнай пляцоўкай

**Такога масавага свята на шлюзе Дамброўка не прыпомняць, хоць традыцыйны фестываль «Аўгустоўскі канал у культуры трох народаў» прайшоў тут 17-ы раз. Рэч у тым, што сёлета беларуска-польска-літоўскае свята праходзіла ў новым фармаце з шырокім прадстаўніцтвам. Упершыню сюды з'ехаліся чыноўнікі, міністры і прадстаўнікі многіх дыпламатычных місій, якія прынялі ўдзел не толькі ў культурнай, але і спартыўнай праграме.**


Фота Віталя ДЗЯРНЕЙКІ.

Шлюз Дамброўка нечым нагадваў невялічкі, але яскравы гарадок з маляўнічымі вуліцамі-падворкамі. Іх «засялілі» прадстаўнікі ўсіх раёнаў Гродзенскай вобласці. Як Аўгустоўскі канал злучыў тры краіны — Беларусь, Польшчу і Літву, так і фестываль аб'яднаў культуру народаў, што тут жывуць.

Кожны прывёз нешта адметнае, старажытнае. Так, многіх жанчын зацікавілі стравы, якія прыгатавалі лідскія гаспадыні. Марыя Кужыновіч расказала, што гатуе «галкі» па рэцэпце дачкі пана Грыфіноўскага, якую яна ведала асабіста. Дык вось, аказалася, што гэтыя польскія «галкі» вельмі падобныя на літоўскія цэпеліны, толькі іх не вараць у вадзе, а абсмажваюць на сале. Дагэтуль карыстаюцца лідчане і рэцэптам пана Дамбавецкага, які вельмі любіў «кулькі бердаўскія». Выпякаюцца тонкія бліны, на якія кладзецца тушанае з цыбуляй мяса, збіраецца блін у мяшочак і звязваецца сцяблом кропа альбо цыбулі.

Усяго на фестываль з'ехалася каля 60 музычных калектываў. Дарэчы, палякі пераанялі гэта свята ў беларусаў і вось ужо чацвёрты раз праводзяць яго ў горадзе Аўгустове. Якраз на мінулым тыдні ў ім прынялі ўдзел і калектывы Гродзеншчыны. Зараз палякі прыехалі на беларускі бок канала, каб свае песні паспяваць, а таксама «дранікаў і каўбасак пакаштаваць». Група польскіх турыстаў з Беластока засталася задаволеная беларускім квасам. Дарэчы, і акрамя стравы тут было з чаго падзівіцца.

Навагрудскі падворак сустрэў стракатымі коўдрамі, якія зроблены ў тэхніцы «пэчворк». Вырабы, што раней ствараліся са шматкоў тканіны, бо цяжка было набыць цэлае палатно, зараз сталі сапраўдным мастацтвам. Метадыст Вольга Юшкевіч расказала, што на майстар-класы прыходзяць як дарослыя, так і дзеці. За вырабы майстрыхі прасілі ад 50 да 100 рублёў.

Пакуль на адным беразе канала спявалі і танцавалі, на другім рыхтаваліся да велапрабегу, які праходзіў у рамках акцыі Bike4SDGs, арганізаванай у падтрымку Мэт устойлівага развіцця ААН. На стартавай пляцоўцы сабралася каля 400 аматараў велаyруху, у тым ліку прадстаўнікі дыпламатычных місій, кіраўнікі міністэрстваў і ведамстваў. Праехаць трасу працягласцю 18 км мог любы ахвотны. Сюды было прывезена некалькі сотняў веласіпедаў, нават з запасам.

Галоўнай асаблівасцю велапрабегу стаў яго інклюзіўны кірунак. Гэта прыклад таго, як людзі з абмежаванымі магчымасцямі прымаюць удзел у агульных мерапрыемствах.

**Пастаянны каардынатар ААН у Беларусі Санака САМАРАСІНХА** адзначыў важнасць інклюзіўных акцый:

— Я лічу, што Беларусь многага дасягнула пасля таго, як падпісала Канвенцыю правоў людзей з інваліднасцю. Мы праводзілі ў мінулым годзе вялікую кампанію «Інклюзіўная Беларусь». Многае яшчэ трэба вырашыць. Напрыклад, збудаваць новую інфраструктуру, а тую, што ёсць, рабіць безбар'ернай, ствараць для інвалідаў працоўныя месцы і адукацыйныя праграмы. Гэта не толькі праблемы Беларусі, але і іншых краін. Цяпер мы сумесна з Міністэрствам юстыцыі распрацоўваем вялікую праграму на тэму інклюзіўнасці.

Многія ўдзельнікі велапрабегу пасля дыстанцыі праселі на байдаркі. Для іх быў арганізаваны маршрут працягласцю 6 км.

Азартнымі аказаліся забавы і гульні. Каманды спаборнічалі па пераносе вёдраў на каромыслах, бегу ў мяшках, насілі бульбу ў гаршках з завязанымі вачыма і біліся мяшкамі над басейнам з вадой. А на другім беражку жанчыны ў народных касцюмах вучылі побытавым танцам, песням і запрашалі ў дружны карагод. Добры настрой удзельнікаў перадаваўся ўсім прысутным.

На думку **міністра спорту і турызму Аляксандра ШАМКО**, такія масавыя мерапрыемствы важна накіраваць на папулярызацыю здаровага ладу жыцця, прыцягваць да іх як мага больш удзельнікаў, у тым ліку моладзь. Аўгустоўскі канал — гэта добрая турыстычная пляцоўка не толькі для Гродзенскага рэгіёна, а і для ўсяе краіны, падкрэсліў міністр.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
*margo@zviazda.by*

# Талерка супу...


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Злева направа: Аляксей КУЛЯШОЎ, Андрэй ГАРУС, Сяргей ШМАТКОЎ і Дзмітрый КАЗІМІРСКІ.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

*— У нашай брыгадзе быў хлопец, які панічна баяўся вышыні, не мог з краю даха ўніз паглядзець, адразу галава кружылася, але сціскаў зубы і працаваў нармальна,* — дадае **Аляксей КУЛЯШОЎ**, які на вышыні працуе сёмы год. — *Хаця калі падумаць, то ты прывязаны на дзвюх вяроўках, тэарэтычна з табой нічога здарыцца не можа. Каб выпасці з сядушкі, трэба яшчэ пастарацца. А вузлы, якія мы вяжам, здараецца, і не адразу развяжаш пасля працы.*

Альпіністы не крыўдуюць на жыхароў, бо ўжо прывыклі да рознай рэакцыі. Адны бачаць у чалавеку, які вісіць за іх акном, злодзея і імкнуцца выклікаць міліцыю (бывала, і прыязджалі яе супрацоўнікі), а другія ўсміхаюцца і працягваюць праз акно кубачак кавы. Некаторыя скардзяцца, што работнікі шумяць, іншыя радуюцца, што над іх домам працуюць.

*— І пагрозы чуем, і падзяку, прызвычаіліся ўжо. Хто рукой памахае, а хто шторы завесіць,* — расказвае Дзмітрый. — *Аднойчы я спускаўся паміж паверхамі і ў акне ўбачыў аголеную дзяўчыну. Збянтэжыўся, нібыта падглядаю, а яна проста ўсміхнулася і далей ляжыць. А адна жанчына мяне не адпусціла ад свайго акна, пакуль я талерку супу не з'еў. Яна сама на будоўлі працуе і так пра мяне паклапацілася.*

Некаторых людзей альпіністы палохаюць, а іншыя жыхары, наадварот, заўзята імкнуцца абараніць жыллё ад «злодзеяў».

*— Дзяўчына чысціла бульбу на кухні, убачыла мае ногі ў фортку і з крыкам збегла з пакоя,* — успамінае Дзіма. — *А колькі раз нам паказвалі нажы і крычалі, што вяроўку перарэжуць, у асноўным п'яныя, вядома... А аднойчы дзед расчыніў акно і з дубальтоўкі цэліўся — ледзьве яго супакоілі.*

## Два тыдні — і ты на вышыні?

Кваліфікацыю прамысловага альпініста можна атрымаць пасля двухтыднёвых заняткаў на курсах у Інстытуце перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.


«Аўстрыйскі праваднік» — вузел, якім можна аб'яднаць дзве вяроўкі ў адно цэлае.

Дзмітрый Казімірскі, напрыклад, яшчэ падчас вучобы ў школе некалькі гадоў займаўся ў турыстычнай секцыі. Малыя хадзілі ў паходы, асвойваліся ў лесе і... вучыліся карыстацца вяроўкамі, нацягвалі іх, імітуючы пераправу цераз раку, вязалі вузлы. Адсюль і навыкі.

*— Я, пэўна, і да курсаў ведаў больш, чым даведаўся на іх,* — смяецца ён. — *Аднак пры той падрыхтоўцы, што там вядзецца, можна за два тыдні з нуля асвоіць майстэрства альпініста. Але ж пры гэтым трэба яшчэ і будаўнічую спецыяльнасць мець. Ну зможаш ты спусціцца па сцяне, а тынкаваць ці шпакляваць як, калі не ўмееш? Я будаўнічай справе вучыўся пакрысе. Раней на якую-небудзь работу (напрыклад, адліў замяніць пад акном) паўдня патрабавалася, цяпер 10—15 хвілін дастаткова.*

Аляксей Куляшоў прыйшоў на вышыню з-за баранкі аўтобуса:

*— Адвучыўся два тыдні на курсах — і ў добры шлях, сцены фарбаваць. А будаўнічую базу дома напрацаваў, усё раблю сам, да будаўнікоў не звяртаюся.*

**Андрэй ГАРУС** ведае, што такое прамысловы альпінізм, з дзяцінства, бо гэтым займаўся яго бацька.

*— Ён мяне яшчэ ў школе навучыў вузлы вязаць, так што пасля арміі таксама ў альпіністы падаўся. Не бачу нічога небяспечнага ў працы на вышыні. Калі ў мяне будзе сын і захоча займацца тым жа, супраць не буду, галоўнае, каб яму гэта падабалася.*

Прамысловы альпініст з кожнай гадзіны павінен працаваць 45 хвілін і 15 — адпачываць. Хлопцы стараюцца заспець добрае надвор'е, каб больш зрабіць, бо зарплата здзельная. А таксама выканаць асабліва шумныя работы (калі, скажам, да фасада трэба прыкруціць уцяпляльнік) да дазволенага часу, бо пасля пяці і па выхадных такое рабіць нельга.

## Вецер, сонца і... ледзяшы

Хлопцы здольныя выканаць любую работу на вышыні. Акрамя фарбавання, уцяплення і мыцця фасада яны могуць прымацаваць на ім шыльду ці кандыцыянер, павесіць гірлянду, зафарбаваць надпіс на сцяне. Аднойчы, кажуць, нават на вышку лазілі сцягі здымаць. Больш за ўсё ім падабаецца ўцяпленне, а вось мыццё — значна менш, бо «калі трэба тэрмінова памыць фасад перад афабоўкай, а надвор'е ўжо халоднае, непрыемна: як ад пырскаў ні хавайся, усё роўна пад іх трапіш».

Працаваць альпіністы пачынаюць, калі паветра на вуліцы награецца да +5 °С. Калі тэмпература ніжэйшая — дом не ўцяпляюць. Немагчыма працаваць на фасадзе ў дождж і спёку. «Калі больш за 32 °С — сам проста расплавішся на сцяне». На вецер хлопцы ўвагі не звяртаюць. Саміх іх са сцяны не здзьме, кажуць, бо вопыт дапамагае, а вось лісты ўцяпляльніка, здаралася, уніз зляталі.

Зімой у прамысловых альпіністаў працы менш. Часцей за ўсё яны збіваюць ледзяшы.

*— Аднойчы толькі адзін дом зрабілі, ішлі на другі, а з яго зрываецца вялізны лядзяш — і проста на капот джыпа. Добра, што з намі камунальнік быў і гэта бачыў, а то даказвалі б потым, што не мы машыну закідалі,* — смяецца Дзіма.

Працуе брыгада і па заказе дзяржаўных структур, і з фізічнымі асобамі. Выязджаюць і за межы сталіцы. Часта падрыхтоўваюць гарады да свята «Дажынкі», вось нядаўна ў Смалявічах фарбавалі ліцэй і інтэрнат.

## «Аўстрыйскі праваднік», «матыль», «булінь»

Самі сябе альпіністы часта жартам называюць будаўнічым спецназам, асабліва калі здараецца працаваць ратавальнікамі.

*— Аднойчы было: бабуля зачынілася ў кватэры так, што замок звонку яе сын адамкнуць не мог, а сама ўпала. Мы якраз непадалёк ад таго месца працавалі. Званіць кіраўніцтва: «Дапамажыце!» Прыехалі, спусціліся з даху на балкон, агарадзілі месца, выбілі шклопакет, выратавалі,* — усміхаецца Дзіма. — *Бывае, што і балконы зразаем. Літаральна на мінулым тыдні хлопцы з нашай фірмы ездзілі здымаць рэшткі разбуранай канструкцыі, што з 3-га паверха на другі звалілася.*

*А аднойчы зваліўся пад'ёмнік, на якім будаўнічыя матэрыялы падымалі на дах, і павіс уздоўж сцяны. Мне званяць, кажуць, едзьце, рэжце яго, хай на зямлю падае. Аднак я яго прыўзняў крыху з дапамогай паліспаста — сістэмы з блокаў і нацягнутай у некалькі разоў вяроўкі — і спусціў уніз.*

Вяроўка альпіністаў даўжынёй 60 метраў вытрымлівае нагрузку ў 2200 кілаграмаў, аднак бывае, што яна пераціраецца. Асабліва калі працуеш на сцяне, дзе пад вокнамі адлівы з вострымі краямі. *«Аднойчы ў аднаго з нашых вяроўка перацерлася і парвалася — праляцеў метры тры ўніз, павіс на страхоўцы»,* — расказваюць хлопцы.

Прамысловыя альпіністы карыстаюцца рознымі вузламі. На даху вяроўку прывязваюць да канструкцый у асноўным на «булінь» — ён ніколі не развяжацца сам па сабе, зрэдку праз «васьмёрку» — вузел, які завязваецца праз карабін. А «аўстрыйскі праваднік» вяжуць, каб аб'яднаць дзве вяроўкі. Гэта трэба, напрыклад, калі над тым месцам, дзе працаваць альпіністу, на даху няма за што зачапіць вяроўку. Такі вузел не соўгаецца па вяроўцы, і да пятлі, што на ім, можна прымацаваць яшчэ нейкі груз.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*


Альпіністы свабодна адчуваюць сябе на вышыні, могуць нават пагушкацца, як на арэлях.

■ Фінансы

# ЗНІЖЭННЕ СТАВАК — БОЛЬШ ДАСТУПНЫЯ КРЭДЫТЫ



**Нацыянальны банк аб'явіў аб зніжэнні стаўкі рэфінансавання з 13 верасня на 0,5 працэнта да 11,5% гадавых. Гэта сёмае зніжэнне паказчыка з пачатку 2017 года. Услед за зніжэннем стаўкі рэфінансавання знізяцца стаўкі па крэдытах і ўкладах.**

— Зніжэнне працэнтных ставак у эканоміцы, — **каментуе рашэнне Нацбанка фінансавы кансультант TeleTrade Жанна КУЛАКОВА,** — абумоўлена галоўным чынам запавольненнем інфляцыі і нясе ў сабе як пазітыўны эфект для эканомікі, так і некаторыя рызыкі. Галоўны плюс — павышэнне даступнасці крэдытных рэсурсаў для бізнесу і насельніцтва. Зараз крэдыты каштуюць амаль у два разы танней, чым год таму. У выніку сукупны аб'ём выдадзеных крэдытаў у першым паўгоддзі прырос на 0,8%, пры гэтым крэдыты насельніцтва выраслі на 7,5%, хоць у аналагічным перыядзе мінулага года адбылося скарачэнне на 0,2%. Прыватныя прадпрыемствы пакуль крэдытуюцца не гэтак актыўна — сукупны партфель такіх крэдытаў з пачатку года скараціўся на 1%. Але важна, што пры гэтым рублёвыя крэдыты прыватнага бізнесу выраслі на 12,7%, а валютныя — скараціліся на 6,8%. Відавочна, што дзякуючы збліжэнню ставак па рублёвых і валютных пазыках пачала расці доля рублёвых крэдытаў.

З другога боку, зніжэнне ставак па крэдытах прыводзіць да росту спажывецкага попыту і пашырае магчымасці бізнесу для далейшага развіцця. Гэты фактар робіцца адным з слупоў эканамічнага росту, які нарэшце намеціўся ў Беларусі сёлета.

Адваротным бокам медаля ў гэтым выпадку з'яўляецца падзенне ставак па дэпазітах, што негатыўна ўплывае на інвестыцыйную прывабнасць беларускага рубля. За апошнія месяцы замарудзіліся як тэмпы прыросту рублёвых укладаў, так і тэмпы скарачэння валютных. А па выніках ліпеня і зусім склалася даўно забытая сітуацыя: валютныя ўклады фізічных асоб выраслі, а рублёвыя — скараціліся. Апошні раз такое здаралася ў кастрычніку 2015 года, амаль два гады таму. Нягледзячы на тое, што стаўкі па ўкладах па-ранейшаму перавышаюць тэмпы росту цэн і абараняюць зберажэнні ад інфляцыі, далёка не ўсе беларусы гатовыя трымаць рублі ў банку пад 7—10%. Хоць такія стаўкі, вядома, значна бліжэй да нормы, чым некалькі дзясяткаў працэнтаў гадавых.

Казаць аб кардынальных зменах паводзін укладчыкаў пакуль рана, але званочак трывожны. Не хацелася б, каб адток рублёў з банкаў на фоне прытоку валюты стаў устойлівым трэндам. Гэта ідзе ў разрэз з палітыкай дэдаларызацыі эканомікі, якая актыўна праводзіцца ў апошнія гады.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Тэндэнцыі

# Дызайнеры з Венеры, а заказчыкі з Марса

## ЧАМУ ІНТЭР'ЕР ПА-ЗА ЗАКОНАМ?

**Гульня слоў у назве вядомай кнігі псіхолага Джона Грэя як мага лепш падыходзіць для апісання адносін дызайнераў інтэр'ера і іх кліентаў. Па ўсім свеце яны спрабуюць знайсці агульную мову ў стварэнні ўнутранага камфорту ў кватэры, доме, офісе. Часам у іх гэта атрымліваецца, часам не — што цалкам нармальна. Адзін хоча сёе, другі — тое... Наша краіна тут не выключэнне. Вылучаецца яна пакуль што ў юрыдычным аспекце ўзаемаадносін двух бакоў. Так склалася, што сёння інтэр'ерны дызайн у Беларусі па-за прававым полем. Няма рэгламенту, няма тэрміналогіі, няма нарматыўных дакументаў. У выніку атрымліваецца, што спрэчку паміж дызайнерам і кліентам вырашыць будзе цяжка ці нават немагчыма. Што рабіць?**



### Спецыялісты ёсць, а паняцця няма

Дызайнеры кажуць: «спытай у пяці кліентаў, што такое дызайн-праект і атрымаеш пяць розных адказаў». **Дырэктар студыі архітэктуры і інтэр'ера «Нота Бэнэ» Тацццяна АНЦІПАВА** лічыць, што праблема заключаецца ў тым, што сёння ў заканадаўстве краіны адсутнічаюць паняцці «дызайн-праект», «дызайн інтэр'ера», а значыць, і разуменне зместу і прызначэння гэтага віду дзейнасці і яго вынікаў. Атрымліваецца, што першапачатковы кліент і дызайнер, аперыруючы рознымі паняццямі і не ведаючы, чаго хочуць адзін ад аднаго. Часта гэта прыводзіць да канфліктных сітуацый. «А калі ўзаемаадносіны выходзяць за рамкі дызайнер—заказчык, абодва бакі сутыкаюцца з праблемай неабароненасці сваіх інтарэсаў, таму што ў прававым полі зноў жа няма разумення тэрміна, які датычыцца дызайну», — тлумачыць Тацццяна Анціпава і адзначае, што практычна кожны трэці заказчык, які прыходзіць у яе студыю архітэктуры, ужо мае негатыўны досвед работы з дызайнерамі інтэр'ера ў мінулым.

«Без літары закона дагавор на дызайн-праектаванне афармляецца як дагавор на прадастаўленне паслуг. Гэта адбываецца па аналогіі з тым, як афармляюцца бухгалтарскія, аўдытарскія паслугі або рэпетытарства. У Грамадзянскім кодэксе ўсяго адна глава рэгулюе адносіны ў праце аказання паслуг, якая ўжываецца на ўсіх выпадках без уліку спецыфікі», — адзначыў **юрыст у галіне дызайн-праектавання Сяргей ЗІКРАЦКІ.**

Пры гэтым сёння толькі ў сталіцы каля 2000 дызайнераў інтэр'ера. Навучальныя ўстановы выпускаюць на рынак сотні спецыялістаў штогод, а выканкамы працягваюць рэгістраваць гэты від дзейнасці. Дзяржаўная праграма «Будаўніцтва жылля» на 2016—2020 гады, якую зацвердзілі ў Савеце Міністраў, паказвае ўстойлівую тэндэнцыю росту цікавасці грамадзян да будаўніцтва індывідуальнага жылля. Да 2020 года плануецца пабудаваць яшчэ 18 мільёнаў квадратных метраў жылля па дзяржпраграме.

Спецыялісты канстатуюць, што паслуга ў галіне дызайну інтэр'ераў запатрабаваная, рынак развіваецца, а з пункту гледжання закона — сферы проста няма. Пры гэтым, калі няма паняцця дызайн заканадаўча, то гэта азначае, што і мэты дызайну размытыя. Правяраць кваліфікацыю дызайнераў таксама складана, бо ніхто не атэстуе іх. Акрамя таго, кантроль кошту паслуг недасканалы і цалкам не можа рэгулявацца.

### У напрамку выйсця

Для вырашэння актуальных пытанняў, барацьбы з непрафесіяналамі, практыкуючыя спецыялісты сферы выступаюць за стварэнне Асацыяцыі дызайнераў інтэр'ера прадметна-прасторавага асяроддзя. Асацыяцыя возьме на сябе ролю рэгулятара дзейнасці дызайнераў, асабліва ў арганізацыі бізнес-працэсаў і пабудовы ўзаемаадносін з заказчыкам. Прафесійная супольнасць зможа сістэматызаваць прафесію, сфарміраваць адзіныя правілы, погляды. Актыўнымі ініцыятарамі і заснавальнікамі Асацыяцыі выступілі студыя архітэктуры і інтэр'ера «Нота Бэнэ» і студыя архітэктуры і дызайну «Чацвёрты квартал», якія займаюць ключавыя пазіцыі на рынку інтэр'ернага дызайну краіны.

«На ўзроўні Асацыяцыі спецыялісты змогуць прапанаваць шаблон дагавора на паслугу дызайн-праектавання, які стане залогам прадуктыўнага і празрыстага супрацоўніцтва ўсіх бакоў. Таксама з'явіцца магчымасць аказваць кансультацыйныя паслугі, юрыдычную падтрымку, выпрацаваць рэкамендаваныя цэны», — адзначыў **дызайнер, архітэктар Аляксандр ТРУСАЎ.** На яго думку, сёння ёсць неабходнасць сістэматызаваць саму прафесію, пазначыць функцыі дызайнера інтэр'ера. «Станаўленне прафесіянала не павінна спыняцца пасля атрымання профільнай адукацыі. Акрамя ведаў у творчай вобласці, дызайнер павінен мець уяўленне аб этапах будаўніцтва, аддзелачных матэрыялах, ведаць заканадаўства ў праектаванні. Бесперапыннае навучанне таксама ўвойдзе ў задачы Асацыяцыі», — дадаў Аляксандр Трусаў.

У сярэдзіне жніўня зацікаўленыя бакі падпісалі мемарандум аб стварэнні Асацыяцыі. Гэта першы крок на шляху надання гэтаму кірунку прававых паўнамоцтваў і рэгулявання.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *Kryzhevich@zviazda.by*

# «ВЫЛЕТ ДАЗВАЛЯЮ!»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У пачатку 70-х, калі стала канчаткова зразумела, што магутнасцяў старога аэрапорта не хапае, было прынятае рашэнне будаваць новы комплекс па-за межамі горада ў раёне Маскоўскай шашы на ўсход ад Брэста. І летам 1976 года першую чаргу новага авіяпрадпрыемства здалі ў эксплуатацыю. Узлётна-пасадачная паласа даўжынёй крыху менш за тры кіламетры атрымала неабходную інфраструктуру. А праз дзесяць гадоў, у сярэдзіне 80-х, адкрыўся і новы будынак аэрапорта. Комплекс быў разлічаны на абслугоўванне 400 пасажыраў у гадзіну. Тут меліся ўсе звычайныя для аэравакзала атрыбуты: рэстаран, бар, сталовая, а таксама гасцініца. Але ў 90-я гады рэзкае скарачэнне пасажырапатоку падкасіла не толькі Брэсцкі аэрапорт. Калі, скажам, у 1990 годзе цераз брэсцкую паветраную гавань прайшло 340 тысяч пасажыраў, то ў 2015 годзе гэта лічба склала ўсяго 14,6 тысячы. Прычыны такога становішча вядомыя: з-за рэзкага павышэння тарыфаў на авіяперавозкі яны сталі недаступныя для сярэднестатыстычнага грамадзяніна.

І ўсё ж да гонару калектыву Брэсцкага аэрапорта, прадпрыемства здолела выжыць у складаных умовах. Арганізоўвалі камерцыйныя перавозкі, чартарныя рэйсы так званых чаўнакоў.

Цяпер з чэрвеня па верасень з Брэста лятаюць самалёты ў Чарнагорыю, Турцыю, Балгарыю. Папулярным стаў і рэгулярны рэйс у Калінінград — ён ажыццяўляецца па панядзелках і чацвяргах. Брастаўчане лятаюць у Калінінград як па рабоце, так і на адпачынак. Аэрапорт таксама выконвае вялікую праграму па абслугоўванні чартарных палётаў. Ён карыстаецца папулярнасцю сярод уладальнікаў прыватных самалётаў. Тут паспяхова прымалі рэйсы з Аўстрыі, Бельгіі, Вялікабрытаніі, Германіі, Даніі, Швейцарыі, Францыі, іншых краін свету.




Фота Аляксандра ШУЛЬГАЧА.

І вось Брэсцкі аэрапорт дачакаўся рэканструкцыі свайго галоўнага складальніка — узлётна-пасадачнай паласы. З сярэдзіны ліпеня будаўнікі дарожна-будаўнічага трэста №4 Брэста прыступілі да работы. Праект рэканструкцыі распрацавала праектнае прадпрыемства «Белдзіпрадар», — ён прадугледжвае трохслойнае пакрыццё паласы, расшырэнне пляцовак для развароту самалётаў. Гэта дасць магчымасць вялікім машынам камфортна прызямляцца і разварочвацца ў канцы паласы.

Паводле інфармацыі намесніка начальніка Брэсцкага філіяла дзяржаўнага прадпрыемства «Белаэранавігацыя» Вадзіма ГУБАРЭВІЧА, новае пакрыццё паласы дазволіць прымаць новыя тыпы паветраных суднаў. Пасля таго як падрадчык скончыць работу, праекціроўшчык правядзе поўнае даследаванне ўзлётна-пасадачнай паласы і дасць заключэнне па трываласці пакрыцця. Паласе будзе прысвоена класіфікацыйная лічба, і чым яна вышэйшая, тым больш розных тыпаў самалётаў зможа прымаць аэрапорт. Калі таўшчыня папярэдняга пакрыцця складала 12 сантыметраў, то новае робяць таўшчынёй 26 сантыметраў. Так, верхні слой будзе ўяўляць сабой шэсць сантыметраў шчэбенева-мастыкавага шчыльнага асфальтабетону.

Галоўны інжынер ДРСУ-15 Будтрэста №4 Андрэй КАСЯК расказаў, што працаваць даводзіцца ў асаблівым рэжыме. Аэрапорт не можа на час рамонту адмяніць рэйсы. Таму будаўнікі мусяць падстройвацца. Яны мяняюць пакрыццё паласы невялікімі яе часткамі, па адным слоі — паміж рэйсамі. Тым самым дазваляюць працаваць паветранай гавані ў штатным рэжыме.



На неабходнасць прывесці ў поўны парадак аэрапорт звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы падчас нядаўняга жнівеньскага візіту ў Брэст. «Калі аэрапорт не загружаны поўнасцю сёння, то гэта не азначае, што ў будучым усё застанецца гэтак жа», — зазначыў Прэзідэнт. І гэтыя спадзяванні падзяляюць у калектыве Брэсцкага аэрапорта. А рэканструкцыя ўзлётна-пасадачнай паласы толькі пачатак шматлікіх перамен. Ужо налета пачнецца рэканструкцыя рулёжнай дарожкі, а пазней і месцаў стаянак для самалётаў. Усё робіцца з тым, каб пабудаваны некалі таленавітым піцерскім архітэктарам Віктарам Арсеньевым будынак аэрапорта, які крыху нагадвае нацыянальны аэрапорт «Мінск», стаў шматлюдным і запатрабаваным.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

**ЗАВЕРЕНО**
Департаментом по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
14.08.2017 г.
Сушко С. А.

г. Минск, 2017

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

## ОБ ЭМИССИИ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ ДЕВЯТОГО ВЫПУСКА
## Закрытого акционерного общества «ТОПЗАПЭЛЕКТРО» (ЗАО «ТОПЗАПЭЛЕКТРО»)

**1. Полное и сокращенное наименование эмитента (на русском и белорусском языках)**

На русском языке:
полное наименование: Закрытое акционерное общество «Топзапэлектро», сокращенное наименование: ЗАО «Топзапэлектро».
На белорусском языке:
полное наименование: Закрытае акцыянернае таварыства «Топзапэлектра», сокращенное наименование: ЗАТ «Топзапэлектра».

**2. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail), сайт:**

Республика Беларусь, 220030, г. Минск, ул. Карла Маркса, дом 25, пом. 12Н, телефон: +375 (17) 363-16-15, факс: +375 (17) 363-79-48, e-mail: tze@tze.by, topzapelektro@mail.ru, сайт: www.tze.by.

**3. Основные виды деятельности эмитента**

Согласно Общегосударственному классификатору Республики Беларусь «Виды экономической деятельности» ОКРБ 005-2011:

| Код | Наименование вида деятельности |
|---|---|
| 41200 | Общее строительство зданий |
| 71110 | Деятельность в области архитектуры |
| 68100 | Покупка и продажа собственного имущества |

**4. Номер текущего (расчетного) счета эмитента, на который будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи, наименование обслуживающего банка**

Денежные средства при проведении открытой продажи облигаций будут поступать на текущий (расчетный) счет эмитента: BY20OLMP30120000826580000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X (г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2, УНП 100429079).

**5. Наименование периодического печатного издания, в котором будет публиковаться бухгалтерская отчетность эмитента в составе, определенном законодательством, информация о принятом решении о реорганизации или ликвидации эмитента либо о возбуждении в отношении эмитента производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве), о внесенных изменениях в проспект эмиссии (далее – периодическое издание, определенное эмитентом для раскрытия информации), а также сроки их публикации**

Раскрытие информации осуществляется в порядке, установленном законодательством, путем ее размещения на едином информационном ресурсе рынка ценных бумаг, опубликования в печатных средствах массовой информации либо доведения до сведения неопределенного круга лиц иным образом, определенным Законом Республики Беларусь «О рынке ценных бумаг» от 5 января 2015 г. №231-З (далее – Закон) либо Республиканским органом государственного управления, осуществляющим государственное регулирование рынка ценных бумаг (далее – Регистрирующий орган), а также ее представление в случаях, установленных Законом, определенному кругу лиц.

Периодическое печатное издание, определенное эмитентом для раскрытия информации, – газета «Звязда».

Раскрытие информации осуществляется в следующие сроки:

- бухгалтерская отчетность эмитента – годовой отчет в срок не позднее одного месяца после его утверждения в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь о хозяйственных обществах;
- информация о принятом решении о реорганизации или ликвидации эмитента – в срок не позднее двух рабочих дней с даты принятия соответствующего решения уполномоченным органом эмитента;
- информация о возбуждении в отношении эмитента производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) – не позднее двух рабочих дней с момента получения эмитентом копии заявления в экономический суд о банкротстве.
- информация о внесенных изменениях в Проспект эмиссии – в срок не позднее семи рабочих дней с даты государственной регистрации соответствующих изменений в Регистрирующем органе.

Кроме того, эмитент раскрывает в соответствии с законодательством Республики Беларусь иную информацию о существенных фактах (событиях, действиях), касающихся его финансово-хозяйственной деятельности, которые могут повлиять на стоимость жилищных облигаций, в порядке и сроки, установленные регистрирующим органом.

**6. Размер уставного фонда**

Уставный фонд эмитента составляет 500 (пятьсот) белорусских рублей. Уставный фонд разделен на простые (обыкновенные) акции в количестве 100 (сто) штук номинальной стоимостью 5 (пять) белорусских рублей за одну акцию. Уставный фонд сформирован в полном объеме за счет денежных средств.

**7. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента**

Депозитарий Эмитента – Закрытое акционерное общество «Минский транзитный банк» (ЗАО «МТБанк»), код депозитария 014, расположен по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, Толстого, 10.

Специальное разрешение (лицензия) №02200/5200-1246-1112 на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, выдано Министерством финансов Республики Беларусь, срок действия бессрочно.

**8. Дата, номер государственной регистрации эмитента и наименование органа, его зарегистрировавшего**

Закрытое акционерное общество «Топзапэлектро» (далее по тексту – эмитент) зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 14 сентября 2000 года №1044 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №100896485.

**9. Место, время и способ ознакомления с проспектом эмиссии облигаций**

Ознакомиться с проспектом эмиссии можно в течение всего срока обращения жилищных облигаций в офисе эмитента ежедневно в рабочие дни (кроме субботы, воскресенья, государственных праздников и праздничных дней) с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: 220121, г. Минск, ул. Притыцкого, д. 39, офис 8Н, либо на сайте эмитента, указанному в п. 2 настоящего эмиссионного документа.

**10. Форма и вид облигаций, объем эмиссии, количество облигаций**

| | |
|---|---|
| Форма и вид облигаций | Жилищные, бездокументарные, именные, конвертируемые |
| Объем выпуска | 3 656 400 (три миллиона шестьсот пятьдесят шесть тысяч четыреста) белорусских рублей |
| Количество облигаций | 5 540 (пять тысяч пятьсот сорок) штук |

**11. Номинальная стоимость облигаций**

Номинальная стоимость одной облигации составляет 660 (шестьсот шестьдесят) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный одному квадратному метру общей площади помещения в жилом доме №22, входящего в состав Объекта строительства.

Эквивалент номинальной стоимости облигаций не подлежит изменению в течение срока обращения облигаций настоящего выпуска.

**12. Цель эмиссии облигаций и направление использования средств, полученных от размещения облигаций. Описание объекта строительства**

Цель эмиссии жилищных облигаций является привлечение денежных средств физических и (или) юридических лиц для осуществления строительства жилого дома №22, входящего в состав строящегося объекта – «Комплекс многоквартирных жилых домов с объектами торгового и общественного назначения по ул. Алибегова, ул. Я. Брыля». Четвертая очередь строительства. Жилые дома №21 со встроенными помещениями, №22 со встроено-пристроенными помещениями торгового и общественного назначения и автостоянка №21а по г/п», (далее – Объект), в том числе для хозяйственной деятельности эмитента, связанной с выполнением им функций заказчика (застройщика) по указанному Объекту строительства и возможностью временного размещения привлекаемых денежных средств на депозитные счета банков.

Денежные средства, полученные от размещения облигаций, будут использоваться Эмитентом в соответствии с целью их эмиссии.

12.1. Решением Минского городского исполнительного комитета от 07.07.2016 №1932 предоставлены земельные участки ЗАО «Топзапэлектро» во временное пользование сроком до 01.08.2018 г. на период строительства Объекта, а также разрешено строительство данного Объекта.

12.2. Свидетельство (удостоверение) №500/1393-7824 о государственной регистрации возникновения прав, ограничений (обременений) прав на земельный участок (права временного пользования) от 30.08.2016 выдано РУП "Минское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

12.3. Архитектурный проект согласован Комитетом архитектуры и градостроительства Мингорисполкома (заключение №12-28/1386М от 28.12.2015). Положительное заключение государственной экспертизы РУП «Главгосстройэкспертиза» по проектной документации Объекта от 07.04.2016 г. №55-15/16).

12.4. Приказ эмитента об утверждении проектной документации на строительство Объекта от 07.07.2016 №41.

Предполагаемый срок сдачи в эксплуатацию Объекта – 1-й квартал 2019 года.

12.5. Проектируемый участок расположен в юго-западной части г. Минска в водоохранной зоне, частично в прибрежной полосе р. Мышка. Территория ограничена: с севера – свободной от застройки территорией, с юга – территорией детского сада и территорией многоквартирной жилой застройки (строящаяся, ЗАО «Топзапэлектро»), с запада – ул. Янки Брыля, с востока – существующей жилой многоэтажной застройкой.

12.6. Строящийся жилой дом расположен в Московском районе г. Минска, не относится к категории повышенной комфортности. Конструктивная схема здания – 1-секционный 20-этажный жилой дом с техническим подпольем и теплым техническим чердаком.

Жилой дом №22 по г/п – 20-этажный, односекционный, на 187 квартир с техническим подпольем и теплым техническим чердаком. В части цокольного и первого этажей запроектированы встроено-пристроенные помещения торгового и общественного назначения с отдельными входами. Несущая система жилого дома запроектирована в монолитном железобетонном рамно-связевом каркасе, состоящем из монолитных железобетонных колонн, монолитных железобетонных стен и жестко сопряженных с ними монолитных дисков перекрытий. Лестничные марши сборные железобетонные. Фундаменты – сплошная монолитная железобетонная плита на естественном основании толщиной 1200 мм. Цокольные стены – железобетонные монолитные толщиной 250 мм.

Общая площадь квартир в жилом доме №22 – 10262,28 кв. м.

**13. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по жилищным облигациям**

**13.1.** Исполнение обязательств по жилищным облигациям 9 выпуска (далее – облигации) обеспечивается залогом недвижимого имущества, принадлежащего эмитенту на праве собственности. Объектом залога выступает следующее недвижимое имущество (изолированные помещения административного и административно-торгового назначения):

| № п/п | Наименование | Адрес | Свидетельство (удостоверение) о гос. регистрации | Площадь, м кв. | Оценочная стоимость, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708117689 | г. Минск, ул. Алибегова, 12Б-3 | №500/451-6856 от 26.11.2013 | 57,3 | 170 688,84 |
| 2 | изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708117694 | г. Минск, ул. Алибегова, 12Б-9 | №500/451-6610 от 04.10.2013 | 89,1 | 265 416,66 |
| 3 | изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708117695 | г. Минск, ул. Алибегова, 12Б-10 | №500/451-6611 от 04.10.2013 | 41,1 | 122 431,25 |
| 4 | изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708117696 | г. Минск, ул. Алибегова, 12Б-11 | №500/451-6612 от 04.10.2013 | 41,4 | 123 324,92 |
| 5 | изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708117697 | г. Минск, ул. Алибегова, 12Б-12 | №500/451-6613 от 04.10.2013 | 65,6 | 195 413,39 |
| 6 | изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708117698 | г. Минск, ул.Алибегова, 12Б-13 | №500/451-6614 от 04.10.2013 | 91,2 | 271 672,29 |
| 7 | изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708117699 | г. Минск, ул. Алибегова, 12Б-14 | №500/451-6615 от 04.10.2013 | 59,3 | 176 646,57 |
| 8 | изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708117700 | г. Минск, ул. Алибегова, 12Б-15 | №500/451-6616 от 04.10.2013 | 55,7 | 165 922,65 |
| 9 | изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708117701 | г. Минск, ул. Алибегова, 12Б-16 | №500/451-6617 от 04.10.2013 | 113,5 | 338 100,92 |
| 10 | изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708117702 | г. Минск, ул. Алибегова, 12Б-17 | №500/451-6618 от 04.10.2013 | 120,7 | 359 548,72 |
| 11 | изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708117706 | г. Минск, ул. Алибегова, 12Б-21 | №500/451-6622 от 04.10.2013 | 59,1 | 176 050,78 |
| 12 | изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708117707 | г. Минск, ул. Алибегова, 12Б-22 | №500/451-6623 от 04.10.2013 | 61,6 | 183 497,94 |
| 13 | изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708117708 | г.Минск, ул.Алибегова, 12Б-23 | №500/451-6624 от 04.10.2013 | 83,7 | 249 330,80 |
| 14 | изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708117709 | г. Минск, ул. Алибегова, 12Б-24 | №500/451-6625 от 04.10.2013 | 98,6 | 293 715,86 |
| 15 | изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708117710 | г. Минск, ул. Алибегова, 12Б-25 | №500/451-6626 от 04.10.2013 | 59,4 | 176 944,45 |
| 16 | изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708117713 | г. Минск, ул. Алибегова, 12Б-28 | №500/451-6629 от 04.10.2013 | 58,0 | 172 774,04 |
| 17 | изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708117714 | г. Минск, ул. Алибегова, 12Б-29 | №500/451-6630 от 04.10.2013 | 58,0 | 172 774,04 |
| 18 | изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708117716 | г. Минск, ул. Алибегова, 12Б-31 | №500/451-6632 от 04.10.2013 | 50,4 | 150 134,68 |
| 19 | изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-7024535 | г. Минск, ул. Притыцкого, д. 39, пом. 8Н | №500/726-1509 от 02.10.2007 | 272,0 | 810 250,66 |
| **ИТОГО:** | | | | **1 535,70** | **4 574 639,46** |

Оценка объекта залогового недвижимого имущества произведена собственником (эмитентом) в соответствии с Актом внутренней оценки имущества от 14.07.2017.

Совокупная оценочная стоимость объекта залогового недвижимого имущества в соответствии с Актом внутренней оценки по состоянию на 14.07.2017 составляет 4 574 639,46 (четыре миллиона пятьсот семьдесят четыре тысячи шестьсот тридцать девять) белорусских рублей и сорок шесть копеек.

Объем обязательств по облигациям составляет 79,93% (семьдесят девять целых девяносто три сотых) процентов от оценочной стоимости недвижимого имущества, обремененного залогом.

Недвижимое имущество, предоставляемое в качестве обеспечения исполнения обязательств по облигациям, никому ранее не отчуждено, не находится в залоге и не обременено иными правами (притязаниями) третьих лиц, в споре и под запретом (арестом) не состоит и не подлежит удержанию.

Продажа облигаций возможна только после фиксации обременения предмета залога в соответствии с законодательством и предоставления в Департамент по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь (далее – Регистрирующий орган) копий документов, подтверждающих фиксацию обременения предмета залога.

Обеспечение по обязательствам эмитента в отношении облигаций действует в течение всего срока обращения облигаций, а также в течение трех месяцев после окончания срока обращения облигаций, за исключением случаев исполнения обязательств по облигациям в полном объеме до истечения указанного трехмесячного срока.

Срок действия обеспечения может быть сокращен в случае досрочного погашения облигаций эмитентом в соответствии с настоящим эмиссионным документом.

Указанное выше недвижимое имущество, может быть использовано в качестве последующего залога.

13.2. Порядок замены обеспечения исполнения обязательств по облигациям

В случае утраты (гибели), повреждении предмета залога либо ином прекращении у эмитента права собственности на него по основаниям, установленным законодательством, эмитент осуществляет полную замену обеспечения исполнения своих обязательств по облигациям выпуска либо в части утраченного, поврежденного, выбывшего по иным основаниям предмета залога и (или) принимает решение о досрочном погашении облигаций (части облигаций) данного выпуска.

В случае принятия решения о замене обеспечения исполнения своих обязательств по облигациям эмитент осуществляет внесение соответствующих изменений в Решение о выпуске облигаций и Проспект эмиссии облигаций.

Замена обеспечения исполнения своих обязательств по облигациям осуществляется эмитентом в течение двух месяцев с момента возникновения основания, влекущего необходимость замены обеспечения.

Информация о замене обеспечения по облигациям публикуется в газете «Звязда» и размещается на едином информационном ресурсе рынка ценных бумаг (далее – Ресурс) в течение семи дней с даты регистрации соответствующих изменений в Регистрирующем органе.

**14. Порядок размещения облигаций**

Размещение облигаций осуществляется путем их открытой продажи физическим и юридическим лицам – резидентам и нерезидентам Республики Беларусь на неорганизованном рынке в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

До момента покупки облигаций, покупатели должны заключить с эмитентом договор в простой письменной форме, предусматривающий обязательства эмитента по строительству жилых помещений владельцам жилищных облигаций (далее – договор с эмитентом).

Цена размещения облигаций определяется исходя из соотношения спроса и предложения, сложившегося в период размещения облигаций на рынке строительства и недвижимости и может отличаться от номинальной стоимости облигаций.

**15. Срок размещения облигаций**

Дата начала открытой продажи облигаций: 21 августа 2017 года.

Дата окончания открытой продажи облигаций: дата продажи последней облигации, но не позднее 27 февраля 2019 года.

**16. Место и время проведения открытой продажи облигаций**

Размещение облигаций эмитент осуществляет ежедневно в рабочие дни (кроме субботы, воскресенья, государственных праздников и праздничных дней) с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: 220121, г. Минск, ул. Притыцкого, д. 39, офис 8Н.

**17. Срок обращения облигаций**

Срок обращения облигаций: 556 календарных дней, с 21 августа 2017 года по 28 февраля 2019 года включительно.

**18. Дата начала погашения облигаций**

Дата начала погашения облигаций: 28 февраля 2019 года.

**19. Дата формирования реестра**

Формирование реестра владельцев облигаций для целей погашения осуществляется депозитарием эмитента по состоянию на 28 февраля 2019 года.

Генеральный директор ЗАО «Топзапэлектро» Д. В. Новиков

Главный бухгалтер ЗАО «Топзапэлектро» М. Л. Гришилова

УНП 100896485

■ Тэма нумара



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# РЭКІ БЕЗ АРЭНДЫ

## Меркаванне грамадскасці пачута: рыбаловы-аматары не будуць плаціць за сваё хобі

**Вясна гэтага года запомніцца як перыяд вострай барацьбы актывістаў-эколагаў і рыбаловаў-аматараў супраць арэнды рэк. Асаблівую актыўнасць праявілі жыхары Гомельскай вобласці, пра што падрабязна пісала «Звязда». Зацікаўленыя ведамствы аператыўна ўнеслі свае прапановы па вырашэнні канфлікту. У прыватнасці, новаўвядзенні ініцыявалі спецыялісты Дзяржінспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету ў сувязі са шматлікімі зваротамі грамадзян, якія сведчылі аб нарастанні сацыяльнага напружання. Указ №247, у адпаведнасці з якім арэнда рэк забароненая, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 11 ліпеня. Мы папрасілі пракаментаваць навацыі прадстаўнікоў профільных ведамстваў і актывіста-эколага.**

### Прывесці ў адпаведнасць

Указ уступае ў сілу з 14 студзеня, а да таго часу аблвыканкамы абавязаны прывесці ў адпаведнасць з яго патрабаваннямі дзеючыя дагаворы арэнды вадацёкаў. Як гэта будзе рэалізавана на практыцы, расказала **Вольга БАРЭЙША, галоўны спецыяліст аддзела рыбалоўнай гаспадаркі і індустрыяльнага рыбаводства дзяржаўнага аб'яднання «Белвадгас»:**

— Дзеючыя дамовы арэнды вадаёмаў будуць сапраўдныя да тэрміну іх заканчэння. Што датычыцца дамоваў аб арэндзе рэк, то ў іх неабходна ўнесці змены і выключыць платнае аматарскае рыбалоўства з 14 студзеня 2018 года. Прамысловая лоўля рыбы дзеючым арандатарам рэк будзе дазволена да заканчэння тэрміну дзеяння дамоваў. Гэта значыць, з часам мы прыйдзем да таго, што рэкі будуць свабодныя ад арандатараў. Адносна арэнды вадаёмаў, то пралангаваць дзеючы дагавор альбо заключыць новы можна будзе толькі па ўзгадненні з Прэзідэнтам.




**Таццяна ЦІТОВА, начальнік аддзела кантролю за аховай і выкарыстаннем аб'ектаў жывёльнага свету Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце** дапаўняе:

— Дзеянне ўказа не закране тых участкаў рэк, што былі перададзены ў бязвыплатнае карыстанне, а не ў арэнду, — гэта некаторыя рэкі на тэрыторыі нашых нацпаркаў, там платнае аматарскае рыбалоўства захаваецца.

Яшчэ на адзін аспект указа звярнула ўвагу Таццяна Цітова: ураду даручана распрацаваць комплексную схему размяшчэння сажалак і абваднення кар'ераў, прыдатных для рыбаводства, на падставе якой надалей гэтыя водныя аб'екты будуць здавацца ў арэнду для гадоўлі таварнай рыбы.

— Гэта дазволіць пазбегнуць сітуацый, калі арандатарам для прамысловай лоўлі перадаваліся прадукцыйныя рыбалоўныя ўгоддзі, якія карысталіся папулярнасцю ў рыбаловаў-аматараў, — рэзюмавала спецыяліст.


**(Заканчэнне на 8-й стар.)**


■ Экатворчасць

## «Золата»... ад прыроды

**У Міністэрстве прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя вызначылі пераможцаў рэспубліканскага конкурсу на самую лепшую публікацыю на экалагічную тэматыку.**

Сёлета за перамогу ў другім этапе конкурсу змагаліся 47 удзельнікаў у розных катэгорыях і з розных рэгіёнаў краіны. Аўтарамі найлепшых матэрыялаў на экалагічную тэматыку ў намінацыі «Наш агульны дом» сталі ўсяго дзевяць з іх. Прыемна адзначыць, што ў гэтым ганаровым спісе ёсць і імёны аўтараў часопіса «Родная прырода», які выходзіць у Выдавецкім доме «Звязда»!

Так, у катэгорыі «навучэнцы» першае месца было прысуджана Дзіяне Каспяровіч, г. Мінск; другое — Дзмітрыю Сароку, Брэсцкая вобл.; трэцяе — Але Сяліцкай, Гродзенская вобл. У катэгорыі «аматары» найлепшымі сталі: I месца — Ала Майсяёнак, Віцебская вобл.; II месца — Сяргей Шаршаневіч, Гродзенская вобл.; III месца — Таццяна Маісеева, Гомельская вобл. Сярод прафесіяналаў перамаглі: Таццяна Талкачова, Мінская вобл.; Вера Артэага, г. Мінск; Вераніка Коласава, г. Мінск.

Віншуем пераможцаў конкурсу на самую лепшую публікацыю на экалагічную тэматыку з гэтай прыгожай перамогай! Няхай ваша творчасць натхняе людзей на добрыя справы для роднай прыроды!

■ Дата

## «Чырвоная кніга» як падручнік

**Першы намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь Ія Малкіна павіншуе школьнікаў з Днём ведаў, расказалі ў прэс-службе Мінпрыроды.**

1 верасня Ія Малкіна наведае адну са сталічных школ, каб павіншаваць вучняў і настаўнікаў з пачаткам навучальнага года. Ія Вітальеўна таксама адкрые першы ўрок для першакласнікаў і ўручыць самым юным школьнікам дзіцячыя кнігі экалагічнай скіраванасці, а таксама падарунак Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — кнігу «Беларусь — наша Радзіма».

У гэты святочны дзень не застанецца без падарунка ад Мінпрыроды і сама ўстанова адукацыі — камплект «Чырвоная кніга Рэспублікі Беларусь» і іншыя кнігі на экалагічную тэматыку папоўняць скарбніцу школьнай бібліятэкі.

■ Экаадукацыя

# ЯК КЛІМАТ ЗМЯНЯЕ НАС?

**З верасня ў грамадскім транспарце і на тэлебачанні пачнуць трансляваць анімацыйныя ролікі на тэму адаптацыі да кліматычных змен, а беларускія школьнікі падчас пазакласных заняткаў змогуць стварыць уласныя відэа пра клімат.**

Гэта стане магчыма дзякуючы інфармацыйнай кампаніі «Змяняецца клімат — змяняешся ты!», якая рэалізуецца Майстэрняй сацыяльнага кіно ў межах праекта «Форум усходніх краін па кліматычных зменах». Ініцыятыву падтрымалі Аўстрыйскі Чырвоны Крыж, Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа і ЕС. Партнёры праекта — Міністэрствы адукацыі і аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

— Ёсць скептыкі, якія не вераць у змяненне клімату і ўплыў чалавека на гэты працэс. Аднак кожны з нас адчуў рэзкую змену надвор'я гэтым летам. І нездарма, — адзначыла **кандыдат геаграфічных навук, каардынатар праекта «Мясцовы клімат», МГА «Экапраект» Марыя ФАЛАЛЕЕВА**. — Нягледзячы на тое, што Беларусь — краіна з умераным змяненнем клімату, тэмпература ў нас за паўстагоддзя павысілася на адзін градус. І гэта зусім не мала. Для параўнання: у межах Парыжскага пагаднення краіны імкнуцца дабіцца, каб тэмпература не змянілася больш чым на два градусы да канца стагоддзя.

Па словах спецыяліста, аднаго градуса дастаткова для пагаршэння якасці вады, павелічэння вегетацыйнага перыяду ў раслін, размнажэння пераносчыкаў хвароб, напрыклад кляшчоў. Павышэнне тэмпературы таксама адмоўна ўплывае на самаадчуванне людзей. Падлічана, што ў спякотныя дні звяртаецца па медыцынскую дапамогу і памірае значна больш беларусаў, чым у халодныя.

— Пазбегнуць змены клімату нельга ні пры якіх абставінах, бо гэта натуральны працэс. Кліматычная сістэма планеты досыць інертная, і мы яе ўжо сур'ёзна расхісталі. Нават калі з заўтрашняга дня ліквідаваць усе антрапагенныя выкіды ў атмасферу, усё роўна мы ўжо выкінулі досыць парніковых газаў, каб нейкі час падтрымліваць катастрафічныя тэмпы змены клімату. Таму сёння важна навучыць людзей адаптавацца да існуючых умоў надвор'я, — лічыць Марыя Фалалеева.

З гэтай мэтай у межах праекта «Змяняецца клімат — змяняешся ты!» былі створаны тры анімацыйныя ролікі і адзін сацыяльны, а таксама навучальны відэаметадычны матэрыял для школьнікаў. З верасня гэтыя работы будуць перададзены сярэднім школам і гімназіям па ўсёй краіне, а ролікі пачнуць круціць у грамадскім транспарце і на тэлебачанні. Таксама матэрыялы з'явяцца ў інтэрнэце на сайце Майстэрні сацыяльнага кіно sockino.by.

Што ж мы ўбачым? Першы анімацыйны ролік раскажа пра неспрыяльныя ўмовы надвор'я, другі — пра распаўсюджанне кляшчоў і меры барацьбы з імі, трэці — пра гарачае надвор'е, сацыяльны ж ролік прысвечаны кліматычным скептыкам. А метадычныя матэрыялы дапамогуць дзецям самастойна зрабіць відэа пра клімат.



— На глабальным узроўні пра клімат гаворыцца шмат. Але звычайныя людзі на вуліцы аб змяненні клімату нічога не ведаюць, — упэўнены **намеснік дырэктара, прадзюсар культурна-інфармацыйнай установы «Майстэрня сацыяльнага кіно», каардынатар праекта «Змяняецца клімат — змяняешся ты!» Кастусь ВАРАБЕЙ**. — Мы вырашылі прысвяціць праект таму, што найбольш блізка чалавеку, — прыстасаванню да ўмоў надвор'я. Вядома, антрапагенны ўплыў на змяненне клімату — не менш важная тэма. Але яна будзе пададзена асобна і крыху пазней.

Эксперты спадзяюцца, што кліматычныя відэаролікі прыцягнуць людзей да экалагічных праблем і павялічаць узровень экалагічнай адукацыі насельніцтва.

Дарэчы, з'явілася спецыяльная кліматычная карта з парадамі, як паводзіць сябе ў канкрэтнае надвор'е. Знайсці яе можна на сайце Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа або МНС у раздзеле «Падрыхтоўка і рэагаванне на надзвычайныя і крызісныя сітуацыі».


**Кацярына КІРЭЕВА.** *katyakireeva@zviazda.by*

■ Браты меншыя

# «ЛІШНІЯ» ЖЫВЁЛЫ

## Што павінны зрабіць людзі, каб праблема чатырохногіх бадзяжак з сацыяльнай не ператварылася ў біялагічную


У Луцку бяздомных сабак не адстрэльваюць, а адпускаюць на волю пасля стэрылізацыі і чыпавання.

**У грамадскае аб'яднанне абароны жывёл «Эгіда» патэлефанавалі прадстаўнікі сталічнага прадпрыемства і папрасілі аб дапамозе: на іх тэрыторыі за кароткі час распладзілася 50 сабак, а пачыналася ўсё з дзвюх аўчарак-вартаўнікоў. На шчасце, усе сабакі засталіся жывыя, для некаторых зоаабаронцы знайшлі новых гаспадароў нават у Швецыі. Але лёс «лішніх» жывёл не заўсёды ласкавы да іх.**

### Няма бадзяжных сабак у пятым пакаленні

У трэцюю суботу жніўня адзначаўся Сусветны дзень бяздомных жывёл. Гэта зусім не святочная дата стала нагодай для правядзення ў мультымедыйным прэс-цэнтры Sputnik Беларусь тэлемоста паміж Мінскам, Бішкекам, Астаной і Кіевам, на які запрасілі людзей, неабыякавых да лёсу братоў нашых меншых.

Зоаабаронцы расказалі, што робіцца ў іх краінах для таго, каб на вуліцах станавілася як мага менш кінутых жывёл. Ва ўсіх краінах, як аказалася, папуляцыя бяздомных жывёл папаўняецца за кошт свойскіх. Людзям не хапае культуры ўтрымання сваіх гадаванцаў, таму ўладальніцкая жывёла не стэрылізаваная па розных прычынах і нярэдка выгульваецца без ланцужка, а часцей і без гаспадара.

«Няма бадзяжных сабак, якія ў пятым пакаленні здзічэлыя. У нас бадзяюцца тыя, за якімі не глядзяць уладальнікі», — адзначыла **кіраўнік грамадскага аб'яднання па абароне жывёл «Инукобо» Лілія САРСЕНАВА** (Казахстан).

На назіраннях абаронцаў жывёл, сярэдні тэрмін жыцця бяздомнага сабакі — адзін год. Ва ўсялякім выпадку ў сеткі службы адлову вельмі рэдка трапляліся сабакі ад 3 гадоў і старэйшыя.

### Каб ад свойскіх не пладзіліся бяздомныя

У Бішкеку, па звестках зоаабаронцаў, налічваецца да 30 тысяч бяздомных жывёл. Першараднa гэтую праблему цяпер вырашаюць у сталіцы, затым пераключацца на рэгіёны. Па словах сузаснавальніка Агульнага фонду «Права на жыццё бяздомным жывёлам» Алы Кабцовай, нядаўна ў сталіцы Кыргызстана прайшла эксперыментальная акцыя па стэрылізацыі жывёл, якія маюць гаспадароў, з мэтай скараціць пагалоўе бяздомных. У Бішкеку ў год адстрэльваюць 10—15 тысяч галоў бадзяжных жывёл, але пасля гэтага на вуліцах не становіцца менш катоў і сабак: аднаго забітага замяняе пяць нованароджаных.

**Галоўны ўрач Бішкекскай ветэрынарнай клінікі Палад СУЛЕЙМАНАЎ** адзначыў: «Адстрэл — найбольш жорсткая частка барацьбы з бяздомнымі жывёламі. Да нас у клініку нярэдка прыносяць цяжка параненых жывёл, якіх ужо немагчыма вылатаваць. Што датычыцца стэрылізацыі, то ў сілу менталітэту людзі не гатовыя плаціць грошы за гэтую працэдуру».

### Падоўжыць ім жыццё

У Астане праграмы грамадскага аб'яднання па абароне жывёл «Инукобо» закранаюць прававыя пытанні, работу з насельніцтвам і акцыі па стэрылізацыі. У сталіцы Казахстана выдзелены сродкі на стэрылізацыю 6 тысяч галоў бяздомных жывёл. Праз акімат (аналаг гарвыканкама) прайшла акцыя па стэрылізацыі жывёл малазабяспечаных уладальнікаў. У 2018 годзе пачнецца будаўніцтва дзяржаўнага прытулку на 1500 сабак і 700 катоў. Па словах кіраўніка «Инукобо» Ліліі Сарсенавай, усе гэтыя ініцыятывы працуюць не так даўно. А пачалося ўсё з літары закону. У прыватнасці, у адпаведнасці з Грамадзянскім кодэксам да бяздомнай жывёлы прымяняюцца агульныя нормы як да нічыйнай маёмасці. І гэта падоўжыла жыццё такіх жывёл на два месяцы! На працягу гэтага часу ажыццяўляецца пошук уладальніка, а потым можна перадаць жывёлу новаму гаспадару. Між тым раней у Астане час ад адлову да эўтаназіі складаў трое сутак.

У перспектыве ў Астане плануюць бадзяжных жывёл стэрылізаваць, пры неабходнасці пажыццёва ўтрымліваць у прытулку і толькі безнадзейна хворых усыпляць. Вядома, што такія крокі робіцца са згоды і пры падтрымцы акімата.

Лілія Сарсенава расказала пра цікавы вопыт: валанцёры прымалі званкі ад гараджан у службе адлову жывёл. «Людзі з задавальненнем «здаюць» і сваіх, і чужых жывёл», — рэзюмавалі валанцёры. Гэты эксперымент дазволіў валанцёрам убачыць праблему бяздомных жывёл з іншага боку і зрабіць выснову, што трэба шмат працаваць у кірунку змены светапогляду людзей.

### Абарона патрэбна не толькі кошкам і сабакам

У Кіеве праблемамі бяздомных сабак зоаабаронцы займаюцца больш за 20 гадоў. За гэты час яны прайшлі шлях ад наіўнага ўспрымання праблемы да разумення, што вырашыць яе можна толькі комплекснымі мерамі. У Кіеве ёсць дзяржаўныя і прыватныя прытулкі для бяздомных жывёл. Па інфармацыі **прэзідэнта Асацыяцыі зоаабарончых арганізацый Украіны Асі СЯРПІНСКАЙ**, у Кіеве налічваецца дзве тысячы бяздомных жывёл.

У 2013 годзе Украіна ратыфікавала Еўрапейскую канвенцыю па абароне свойскіх жывёл. Цяпер у Вярхоўнай радзе на разглядзе знаходзіцца закон па абароне свойскіх жывёл, у адпаведнасці з якім узмоцніцца пакаранне за іх выкідванне на вуліцу. Рашэнне праблемы бадзяжных жывёл у Кіеве бачаць у наступнай формуле: рэгістрацыя гадаванца, чыпаванне, стэрылізацыя. «Я змагаюся не за тое, каб жывёлы мелі права жыць на вуліцы, а за права жыць у людзей», — рэзюмавала Ася Сярпінская.

На думку ўдзельнікаў тэлемоста, Украіна далёка наперадзе ўсіх па ўладкаванні бяздомных жывёл. Між тым Ася Сярпінская з болем гаварыла пра тое, што ў Кіеве ёсць рух догхантараў, і, на жаль, толькі адзінак з іх атрымліваецца прыцягнуць да адказнасці.

**Дырэктар Кіеўскага эколага-культурнага цэнтра Уладзімір БАРЭЙКА** нагадаў, што ў Англіі закон пра жывёл быў прыняты ў 1822 годзе. У СССР падобнага закона не было. У 2006 годзе Украіна стала другой пасля Латвіі постсавецкай краінай, у якой прыняты закон пра жывёл.

Гаворачы аб абароне жывёл, мы часцей за ўсё маем на ўвазе бяздомных катоў і сабак. Аднак, на думку Уладзіміра Барэйкі, у абароне маюць патрэбу і сельскагаспадарчыя, і дзікія жывёлы. Украінскія зоаабаронцы лічаць неабходным забараніць выкарыстанне жывёл у цырку і іншых забаўляльных установах. Ва Украіне з 2004 года забаронена веснавое паляванне, а ў 2010 годзе па ініцыятыве Кіеўскага эколага-культурнага цэнтра быў прыняты закон, які забараняе паляванне ў біясферных запаведніках, нацыянальных парках, рэгіянальных ландшафтных парках, а таксама ў ахоўных зонах прыродных запаведнікаў.

### Дзяцей улюбёнцаў выкідваюць на вуліцу

Адзіным метадам рэгулявання колькасці бадзяжных жывёл у Беларусі з'яўляецца адлоў і адстрэл. Па звестках Міністэрства ЖКГ, штогод падвяргаюцца адстрэлу і эўтаназіі каля 70 тысяч жывёл, у гэтую страшную статыстыку не ўваходзяць жывёлы, адстраляныя іншымі службамі.

За 10 гадоў існавання грамадскага аб'яднання абароны жывёл «Эгіда» валанцёры і чыноўнікі не змаглі прыйсці да згоды па пытаннях законапраекта аб абароне жывёл. Першыя разглядаюць дакумент як рэгламент абароны жывёл, другія — як рычаг па абмежаванні іх утрымання. Тым не менш цяпер законапраект аб абыходжанні з жывёламі знаходзіцца на разглядзе ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. **Старшыня грамадскага аб'яднання абароны жывёл «Эгіда» Вераніка ХАНЦЭВІЧ** адзначыла, што насельніцтва недастаткова ведае аб стэрылізацыі і кастрацыі жывёл. Часам уладальнікі жывёл кажуць, што «для здароўя» кошцы або сабачку неабходна адчуць сябе маці. Таксама сустракаюцца і ветэрынары, якія актыўна падтрымліваюць гэтую ідэю. Аднак чамусьці такім «чулым» людзям нішто не перашкаджае выкінуць дзяцей улюбёнкі на вуліцу.

Шмат хто адмаўляецца ад стэрылізацыі жывёл па рэлігійных меркаваннях. На гарадскім узроўні ў Мінску не праводзіліся акцыі па стэрылізацыі жывёл, аднак валанцёраў падтрымліваюць як прыватныя, так і дзяржаўныя ветклінікі і робяць скідкі пры правядзенні стэрылізацыі падапечных абаронцаў жывёл.

Як адзначыла Вераніка Ханцэвіч, у нашай краіне не рэгламентавана дзейнасць заводчыкаў. Таму часам пад выглядам пародзістага шчанюка прадаецца паўкроўка. У выніку падросшая жывёла не апраўдвае надзей гаспадара, і ён яе проста выкідвае на вуліцу.

Прадпрыемства «Фаўна горада» функцыянуе з 2004 года. Яно ажыццяўляе адлоў безнаглядных жывёл па папярэдніх заяўках ЖЭСаў і іншых арганізацый. Для работнікаў гэтага прадпрыемства кожны безнаглядны сабака або кошка з'яўляецца бяздомным і падлягае адлову. Калі хто-небудзь думае, што ашыйнік — гэта маркер уладальніцкай жывёлы, то памыляецца. У гаспадароў ёсць пяць дзён, каб забраць свайго гадаванца з «Фаўны горада». У вальерах гэтага прадпрыемства больш за пяць дзён жывёлы не ўтрымліваюцца, затым іх усыпляюць. Па словах Веранікі Ханцэвіч, беларускія зоаабаронцы дамагаюцца, каб бяздомныя сабакі прайшлі працэдуру стэрылізацыі і чыпавання. Яна адзначыла, што ў неафіцыйных прытулках сабакі і каты жывуць да смерці. Вядома, ім імкнуцца знайсці адказных гаспадароў. І такія людзі знаходзяцца, шанц здабыць свой дом ёсць нават у жывёл-інвалідаў, калі калецтва не прычыняе ім пакут.

### Адкуль «прыйшло» шаленства?

**На мінулым тыдні ў Віцебску кошка памерла ад шаленства. Па словах уладальніцы жывёлы, кошка ніколі не была на вуліцы, таму не магла заразіцца шаленствам. Але таксама вядома, што ў жывёлы не было ветпашпарта, што звычайна азначае: ёй не рабілі прышчэпкі супраць розных хвароб. Незвычайны выпадак мы папрасілі пракаментаваць вядучага ветэрынарнага ўрача аддзела вірусалогіі Мінскай абласной ветэрынарнай лабараторыі Валянціну ШАМРАЙ.**

**— Такое немагчыма, каб кошка ніколі не была на вуліцы. У рэшце рэшт, аднекуль жа яна з'явілася ў кватэры. Каб высветліць, пры якіх абставінах жывёла захварэла, трэба ведаць, адкуль яе ўзялі і ў якім узросце, — тлумачыць Валянціна Мікалаеўна. — Мяркую, што кошка, па-першае, была на вуліцы, па-другое, яна магла кантактаваць з хворымі жывёламі. Магчыма, уладальніца забылася, што, напрыклад, прыходзіла да яе ў госці сяброўка з сабакам. Тэарэтычна кошка магла заразіцца ад мышэй, але яны рэдка хварэюць. Таксама, як у нас кажуць, хваробу можна было прынесці на нагах, то-бок гаспадыня была ў лесе і прайшлася па слядах хворай жывёлы. Кошцы дастаткова пацерціся каля таго абутку.**

**Магу даць параду: абавязкова кожны год рабіце гадаванцу прышчэпку ад шаленства, і ўсё з ім будзе добра.**

# Рэкі без арэнды


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### Хто будзе зарыбляць рэкі?

Тыя, хто выступаў за арэнду рэк, аргументавалі сваю пазіцыю тым, што арандатары займаюцца зарыбленнем рэк. Між тым Правіламі вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства абавязак па зарыбленні рыбалоўных угоддзяў фонду запасу ўскладзены на аблвыканкамы.

Аднак, па словах Вольгі Барэйшы, за апошнія гады абласныя выканаўчыя камітэты не выдаткоўвалі сродкаў на зарыбленне. Склалася такая практыка, што зарыбленнем займаюцца ў прапорцыі 50 на 50 арандатары і Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў.

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Зарыбленне — даволі няпростая справа, бо патрабуе пэўных выдаткаў і выканання шэрагу працэдур. Зарыбленне ажыццяўляецца на падставе рыбаводна-біялагічнага абгрунтавання або абгрунтавання на зарыбленне, якія прайшлі дзяржаўную экалагічную экспертызу.

— Часам абывацель думае, што зарыбляюць вадаёмы і рэкі наяўным матэрыялам, на самай справе ўсё рэгламентуецца: віды рыб, тэрміны для кожнага канкрэтнага вадаёма. Сама працэдура зарыблення праходзіць у прысутнасці камісіі ў складзе прадстаўнікоў Мінпрыроды, Мінсельгасхарча і Дзяржінспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету і складаецца акт зарыблення, які зацвярджаецца Мінсельгасхарчам, — растлумачыла Вольга Барэйша.

### Прамысловая лоўля ці браканьерства?

**Каардынатар «Зялёнага дазору» па Мазыры Павел НАЗДРА** быў адным з ініцыятараў звароту ў дзяржаўныя органы з мэтай дамагчыся адмены арэнды рэк.

— Рыбаловы-аматары рады, што Указам №247 адменена платная рыбалка. Безумоўна, мы пазітыўна ацэньваем той факт, што ўлада прыслухалася да меркаванняў эколагаў і пачула голас рыбаловаў, — кажа актывіст.

Тым не менш у эколагаў ёсць асцярогі. «Арандатары будуць карыстацца дазволам на прамысловую лоўлю рыбы, а па факце займацца браканьерствам», — мяркуе Павел Наздра.

Каб гэтага не адбылося, неабходна ўзмацненне кантролю з боку Дзяржінспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету, органаў мясцовай улады і грамадскасці. З пачатку года супрацоўнікі Дзяржінспекцыі выявілі нямала нядбайных арандатараў. На думку Паўла Наздры, вельмі цяжка, практычна немагчыма праверыць, колькі вылавілі рыбы, бо «каля кожнай брыгады дзяржінспектара не паставіш». Каардынатар «Зялёнага дазору» задаецца заканамерным пытаннем: чаму на прылаўках крамаў мала беларускай рачной рыбы.

— Мяркую, рыба рэалізуецца на «шэрым» рынку, падаткі ад яе продажу не паступаюць у бюджэт, — гаворыць Павел. У сувязі з гэтым, пытанне: якім чынам зацвярджалі дагаворы арандатарам, калі тыя загадзя ведалі, што не змогуць выканаць умову аб пастаўцы рыбы ў гандлёвыя сеткі. Гэта значыць, перад зацвярджэннем дагавора арандатары павінны былі мець дагаворы аб рэалізацыі рыбы.

Адным словам, прыйдзецца не толькі прыводзіць дагаворы ў адпаведнасць з патрабаваннямі Указа №247, але і сачыць за тым, каб арандатары выконвалі ўзятыя на сябе абавязацельствы. Дарэчы, сярод іншых прапісана і добраўпарадкаванне берагавой лініі. Аднак не кожны арандатар траціць на гэта час і сродкі. Адпаведна, выкананне ўсіх дамоў неабходна кантраляваць як органам улады, так і грамадскасці, а таксама агульнымі намаганнямі весці работу з насельніцтвам з мэтай павышэння экалагічнай культуры.

**Матэрыялы падрыхтавала Аксана ЯНОЎСКАЯ.** yanovskaya@zviazda.by

■ Ахова лесу

# ПАТУШЫЦЬ «БІЯЛАГІЧНЫ ПАЖАР»

## ЯК У НАШАЙ КРАІНЕ ЗМАГАЮЦЦА З КАРАЕДНЫМ УСЫХАННЕМ САСНЫ

**Апошнім часам усе позіркі спецыялістаў лясной аховы звернуты на паўднёвыя рэгіёны краіны: Брэсцкую, Гомельскую вобласці, часткі Мінскай і Магілёўскай абласцей. Менавіта там актыўна размнажаюцца жукі-караеды і знішчаюць сасну — адну з галоўных лясных культур Беларусі. Каб спыніць нашэсце, якое захапіла 14,9 тысячы га лесу, разам працуюць як мясцовыя, так і паўночныя, вольныя ад ствалавых шкоднікаў, лясгасы.**

### Маленькі жук — вялікая пагроза

На дзялянцы Ямінскага лясніцтва Любанскага лясгаса, куды мы прыехалі разам са спецыялістамі лясной аховы, бачныя сляды ад вогнішчаў. Па словах **галоўнага ляснічага ДЛГУ «Любанскі лясгас» Валерыя СУХНАТА**, некалькі тыдняў таму тут працавалі прадстаўнікі Барысаўскага лясгаса. Яны выдалілі пашкоджаныя караедам дрэвы і спалілі рэшткі. На сёння такія мерапрыемствы — пакуль адзіны спосаб змагацца са шкоднікам.

Але наша мэта — не знаёмства з ачышчанай лесасекай, а... пошук дрэў, на якіх ужо паспеў пасяліцца вораг лесу, а драўніна пакуль не высахла. Галоўны ляснічы і **інжынер-лесапатолаг Івацэвіцкага лясгаса Валерыя ЗІНОВІК** уважліва ўзіраюцца ў верхавіны соснаў.

— Характэрныя прыкметы мадэльнага дрэва: больш светлая ігліца, адсутнічае сёлетні прырост. Такая расліна паступова страчвае сваю біялагічную ўстойлівасць і становіцца больш уразлівай для хвароб і шкоднікаў, — расказвае Валерыя Зіновік.

Сасна з падобнымі асаблівасцямі знаходзіцца даволі хутка. Яна і трапляе «пад нож». Пад карой бліжэй да вяршыні лесапатолаг заўважае смалістую пляму — тут вяршынны караед паспрабаваў пранікнуць у сасну, але атрымаў адпор. Дрэва выдзеліла дастатковую колькасць смалы і не дазволіла яму засяліцца.

— Але пры вялікай колькасці караедаў нават здаровае дрэва можа быць пашкоджана, — адзначае **загадчык кафедры лесааховы і драўніназнаўства БДТУ Вячаслаў ЗВЯГІНЦАЎ**. — Насякомыя паводзяць сябе як камікадзэ — гінучы пад смалой, яны адначасова аслабляюць сасну перад атакамі новых жукоў.

Вяршынны караед звычайна пасяляецца ў тонкай кары невялікіх галінак сасны, затым пераходзіць на крону і паступова спускаецца бліжэй да зямлі. Таму гэтага шкодніка складана знайсці, у адрозненне ад яго сабрата шасцізубага караеда (стэнографа), што жыве ў ніжняй частцы дрэва. Размножыўшыся, вяршынны караед — невялікі жучок даўжынёй усяго каля 3 мм — стаў сапраўдным бедствам для краіны, якое нават называюць біялагічным пажарам.

Чаму ж «разгарэўся» гэты пажар? Навукоўцы і спецыялісты лясной гаспадаркі ўпэўнены — штуршком да масавага ўсыхання сасновых насаджэнняў і іх паражэння сталі экстрэмальныя пагодныя ўмовы надвор'я апошніх гадоў (памяншэнне колькасці ападкаў, паніжэнне грунтавых водаў, доўгія засухі і ўраганныя вятры). Недахоп вады аслабіў дрэвы і дазволіў шкоднікам больш паспяхова атакаваць іх. Акрамя таго, на думку вучоных, на павелічэнне колькасці звычайная для беларускіх лясоў жука паўплывала і адмова ад спальвання рэшткаў высякання, якая стала прымяняцца згодна з нарматывамі лясной сертыфікацыі FSC.

Ачагі караеднага ўсыхання сасны ўпершыню былі выяўлены ў 2010 годзе ў Гомельскім лясгасе. У 2015-м Інстытут лесу НАН Беларусі сумесна з БДУ распрацавалі ферамонныя пасткі для кантролю колькасці шкоднікаў. Дзякуючы гэтаму ўдалося вызначыць, што праблема характэрна для большасці абласцей рэспублікі. З 2016 года ў краіне пачалася работа па прадухіленні распаўсюджвання шкодных насякомых — летась у беларускіх лясах было высечана 3,7 тыс. га расстроеных насаджэнняў.

Сёння пра аналагічныя праблемы гавораць і ў прыгранічных раёнах Украіны і Польшчы, а таксама Фінляндыі, Германіі і іншых еўрапейскіх краінах. У суседняй Польшчы з-за жука-караеда нават адбыўся буйны экалагічны скандал: мясцовыя ўлады пачалі высякаць заражаныя дрэвы ў Белавежскай пушчы, што выклікала хвалю абурэння часткі грамадскасці і вучоных.

У Беларусі з жуком змагаюцца ў тых лясах, дзе вядзецца гаспадарчая дзейнасць. Для аператыўнай распрацоўкі ўсыхаючых насаджэнняў і прадухілення масавага распаўсюджвання шкоднікаў Мінлясгас забараніў правядзенне планавых высечак, а на дапамогу лясгасам, што пацярпелі ад атакі жукоў-караедаў, былі накіраваны спецыялісты з паўночных рэгіёнаў краіны.

### Выратаваць дрэва, пакуль не позна

Яшчэ адна сасна, якая адпавядае крытэрыям нашага пошуку, аказваецца «ўраджайнай» на розных насякомых. Бліжэй да кроны спецыялісты заўважаюць тыповы малюнак, што пакідае пасля сваёй дзейнасці вяршынны караед: шлюбную камеру ў выглядзе зоркі, ад якой адыходзяць мацярынскія хады. Але самога шкодніка тут мала — ён амаль скончыў сваю справу і адправіўся шукаць новую ахвяру-сасну.

А вось ніжэй на ствале шчыруюць іншыя жукі, у тым ліку і караед-стэнограф. Па словах Вячаслава Звягінцава, успышка колькасці вяршыннага караеда падцягнула экалагічны каскад — дазволіла іншым шкодным насякомым таксама актыўна размнажацца. Пры гэтым драпежныя насякомыя, птушкі і лясныя хваробы не былі гатовыя да такога росту. Таму пакуль толькі чалавек можа некаторым чынам кантраляваць колькасць караеда.

— Вельмі важна не спазніцца з высечкай — дрэвы неабходна сячы менавіта на этапе засялення шкоднікаў, калі маладое пакаленне жука знаходзіцца пад карой. Толькі такая высечка будзе эфектыўнай, і з яе дапамогай можна паўплываць на колькасць насякомых, — упэўнены Вячаслаў Звягінцаў. — Высякаць руды лес ужо позна — гэтыя мерапрыемствы маюць толькі лесагаспадарчае значэнне, каб выратаваць пашкоджаную драўніну.



Фота БЕЛТА.

**У найбліжэйшы час пад эгідай Мінлясгаса плануецца распрацаваць і пачаць рэалізоўваць комплексную праграму павышэння ўстойлівасці і аховы сасновых насаджэнняў з прыцягненнем вядучых вучоных Інстытута лесу НАН Беларусі і іншых навуковых устаноў.**
**«Лекі» ад караеднага ўсыхання сасны беларускія навукоўцы шукаюць і разам з калегамі з іншых пацярпелых краін — Польшчы, Фінляндыі, Францыі.**

Праз некалькі сотняў метраў ад выпрацаванай лесасекі бачныя роўныя шэрагі нядаўна высечаных дрэў і побач — рэшткі высякання. Сосны, якія яшчэ не страцілі свае тэхнічныя якасці, чакаюць тэхніку, каб у хуткім часе быць вывезенымі з лесу на перапрацоўку. Звычайна дрэвы перад адпраўкай апрацоўваюць прэпаратамі, каб жук не паспеў выбрацца з-пад кары. Рэшткі высякання праз некаторы час будуць спалены.

Па словах Валерыя Сухната, за бягучы год сіламі Любанскага і іншых лясгасаў санітарныя высечкі праведзены на 845 га сасновых насаджэнняў, пашкоджаных караедам. А каб своечасова выяўляць ачагі пашкоджання, спецыялісты ацэньваюць стан дрэў не толькі з зямлі, але і з паветра — для гэтага лясгас закупіў квадракоптар.

Паколькі жук-караед за год можа даць некалькі патомстваў, і з надыходам халадоў у лясах работа не спыніцца. З 14,9 тыс. га лесу, пашкоджанага караедам, сёння санітарныя высечкі праведзены на 13,5 тыс. га. Завяршыць работу па ліквідацыі ачагоў караеднага ўсыхання работнікі лясной гаспадаркі плануюць да 1 студзеня 2018 года. А наступнай вясной на ўсіх выпрацаваных з гэтай нагоды лесасеках з'явіцца малады лес.

**Вераніка КОЛАСАВА.**
*kolasava@zviazda.by*

### Цікавыя факты пра жука-караеда



- **Вяршынны караед харчуецца жывой і багатай на карысныя рэчывы часткай кары — лубам. Па ім пажыўныя рэчывы і прадукты фотасінтэзу рухаюцца з кроны ўніз па дрэве.**
- **Колькасць караедаў, якія здольныя жыць на адным дрэве, можа дасягаць ад 3 да 40 тыс. асобін.**
- **Жукі-караеды здольныя знайсці аслабленыя сосны па паху.**
- **Ад шкодніка могуць пацярпець як спелыя насаджэнні, якім каля 80 гадоў, так і дрэвы, пасаджаныя 10 гадоў таму.**
- **Спецыялісты падлічылі: прыкладна праз месяц ад моманту засялення караедам дрэва становіцца рудым і фактычна гіне.**

■ У свеце жывёл

# Змей больш не становіцца!

## Але як жыць сумесна з тымі, што ўжо ёсць?

**У жніўні ў раёне Каменнай Горкі адна гадзюка ўкусіла дзіця, у гэтым жа месяцы іншая запаўзла ў пліту адной з мінскіх кватэр. Такая актыўнасць змей вельмі ўсхвалявала беларусаў. Але спецыялісты запэўніваюць, што турбавацца не трэба — у нашай краіне змей больш не стала!**



Гадзюка — адзіная ў Беларусі змяя, укус якой атрутны, але не смяротны для дарослага чалавека. Аднак на дзяцей, алергікаў, цяжарных і людзей з якімі-небудзь захворваннямі ён можа дзейнічаць па-рознаму. Таму ў любым выпадку лепш адразу звярнуцца па медыцынскую дапамогу.

Да прыезду хуткай неабходна піць больш вады, менш варушыцца, паколькі пры лішніх рухах яд можа распаўсюдзіцца па ўсім целе і, па магчымасці, прыняць антыгістамінны сродак (напрыклад, супрасцін). Выдаляць яд самастойна можна толькі на працягу першых пяці хвілін пасля ўкусу. Для гэтага трэба надоўжна разрэзаць ранку, націснуць на яе пальцамі і выціснуць яд. Вядома, лепш гэта даверыць напарніку.

Гадзюкі, як правіла, жывуць на ўзлеску і каля вадаёмаў, у адкрытых мясцовасцях яны сустракаюцца рэдка. Таму знаёмства са змеямі можна пазбегнуць, калі не наведваць іх аблюбаваныя месцы.

Калі вы ўсё ж такі сабраліся ў грыбы ці ягады, то прытрымлівайцеся шэрагу нескладаных правілаў. Па-першае, абувайце высокія боты (не ніжэй за 30—40 см), яны могуць быць незабаўляскова кірзавымі, дастаткова звычайных гумавых. Па-другое, аглядайце той участак, куды збіраецеся нахіліцца або прысесці. Патрэсце, пазбягайце плаўных рухаў. Звычайна змеі чуюць шум і разбягаюцца.

— Гадзюкі ніколі не нападаюць першымі. І кусаюць яны толькі калі чалавек па неасцярожнасці або няўважлівасці дакранаецца да іх, — лічыць **вядучы навуковы супрацоўнік НПЦ НАН Беларусі па біярэсурсах, кандыдат біялагічных навук Сяргей ДРАБЯНКОЎ**. — Пры сустрэчы са змяёй не трэба панікаваць і, тым больш, спрабаваць яе забіць. Лепш паназірацць ці проста прайсці міма.

Па словах Сяргея Драбянкова, на гадзюк часта скардзяцца дачнікі. Але нават калі змяя запаўзла на ваш участак — забіваць яе не варта. Заўсёды можна звярнуцца да спецыялістаў ці акуратна вынесці змяю з двара самастойна.

— У Беларусі каля паўмільёна гадзюк і больш іх не становіцца! — сказаў спецыяліст. — Змеі — гэта важная частка экасістэмы. Яны ядуць пацукоў і мышэй, якія шкодзяць на палях і агародах. Нельга забываць, што гадзюкі з'яўляюцца сыравінай для вытворчасці лекавых мазяў.

Змеі рэдка з'яўляюцца на дагледжаных участках. Таму трэба сачыць за газонам, не ствараць звалак, таксама, пажадана, абгарадзіць свой двор невялікім плотам.

Як расказалі ў Мінпрыроды, акрамя гадзюкі на тэрыторыі Беларусі водзіцца яшчэ два віды змей. З іх вуж — самы мірны. Ён заўсёды імкнецца ўцячы ад чалавека. Мядзянка занесена ў Чырвоную кнігу. Сустракаецца яна вельмі рэдка. Часцей за ўсё яе блытаюць з бурым вужом або яшчаркай-вераценніцай.

Адрозніць змей адну ад адной не складана. Цёмна-шэрая скура гадзюкі пакрыта зігзагападобным узорам. Мядзянка мае карычневы колер, а вуж — шэры з жоўтымі плямамі па баках.

**Кацярына КІРЭЕВА.** *katyakireeva@zviazda.by*

**Па народных павер'ях, змеі знаходзяцца на зямлі да Узвіжання, якое адзначаецца 27 верасня. У гэты дзень гадзюкі збіраюцца ў адно месца, каб паўзці на зіму «ў вырай». Таму ў народзе існавала строгая забарона хадзіць у лес 27 верасня: «У гэты дзень няможна ісці ў лес у грыбы і ягады: змеі, калі збяруцца, заўважыўшы чалавека, пойдуць за ім з лесу і зноў надоўга распаўзуцца па акрузе, каб шкодзіць людзям за парушэнне спакою».**


**Чытайце ў жнівеньскім нумары часопіса «Родная прырода»**

- ✓ **Дачны сад на навуковай аснове**
- ✓ **Навошта здаваць гаджэты ў перапрацоўку?**
- ✓ **Хто ў доме гаспадар: чалавек ці... павук**
- ✓ **Птушкі шчасця Уладзіміра Панцялеева**



■ Фотарэпартаж

# ПА СЦЯЖЫНЕ БЯРЭЗІНСКАГА БАЛОТНІКА



**Ужо шэсць гадоў запар у Бярэзінскім біясферным запаведніку з поспехам праходзяць пазнавальна-экалагічныя экскурсіі ў свет беларускіх міфаў і легендаў.**



Турыстаў па міфалагічнай сцежцы водзіць галоўны герой экскурсійнай праграмы — Віктар Роўда — работнік турыстычнага аддзела і экалагічнай асветы ўстановы, тэатрал і рэжысёр па адукацыі. Гэта яму прыйшла ідэя расказаць пра нашу багатую прыроду і праблемы экалогіі праз вядомых герояў беларускіх народных міфаў. Падчас экскурсіі Віктар сам выступае ў ролі Балотніка: надзявае маску, адмысловы сцэнічны строй, ператвараецца ў хітруна і мудрага дзядка, які аберагае свой адвечны «біятоп». Дух Балотніка, паводле меркаванняў айчынных фалькларыстаў, жыве ў балотах запаведніка болей за шэсць стагоддзяў. А Балотнік Віктара Роўды за гэты час стаў любімым героем многіх турыстаў.

— Тэма міфаў і легендаў заўсёды лунала ў паветры нашага запаведніка, а колькасць сакральных месцаў паданняў, казак і проста народных баек пра цудадзейныя з'явы тут шмат, — кажа Віктар Роўда, калі мы прайшлі з ім усю сцяжыну з самага пачатку да канца. — Згодна з вераваннямі нашых продкаў, кожны біятоп меў свайго «заступніка». З некаторымі з іх мы і знаёмім. Асабліва турыстам падабаюцца вобразы Вужовага Караля і яго дачкі, Аржавеня, інсталяцыі хаткі Кладніка і «русальчынай» бярозы.

Сёлета ў чэрвені, на аснове экскурсійнага праекта з Балотнікам, адбылася прэзентацыя Цэнтра міфалагічнага турызму. Цяпер экскурсіі ў Бярэзінскім запаведніку будуць пачынацца з наведвання «Музея міфічных істот». Дарэчы, музей пабудаваны з дапамогай арганізацыі ПРААН у межах праекта «Садзейнічанне пераходу Рэспублікі Беларусь да «зялёнай» эканомікі», а таксама пры ўдзеле БГА «Адпачынак у вёсцы», якая займаецца нематэрыяльнай спадчынай у нашай краіне ў сферы турызму.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**







■ Друкуецца ў «Роднай прыродзе»

# «У МОЙ КУБАК, КАЛІ ЛАСКА!»

## У Мінску стартавала кампанія супраць выкарыстання аднаразовых пасудзін



**А запусцілі яе выпускніцы экалагічнага маладзёжнага адукацыйнага цэнтра «Экастарт» пры падтрымцы Цэнтра экалагічных рашэнняў і «Зялёнай сеткі». Мы пагаварылі з арганізатарамі і даведаліся пра мэты кампаніі, а таксама пра тое, якіх вынікаў ужо дасягнулі і плануюць дасягнуць мінчанкі.**

Аднаразовы посуд — гэта тавар, пра выкарыстанне якога цяпер ужо нават не задумваюцца, так часта яго сталі ўжываць. Штодня ў кафэ прадаюць сотні літраў напояў «на вынас». Цікавая форма і яркія колеры кубачкаў прыцягваюць пакупнікоў. Аднак складана падлічыць, колькі рэсурсаў сыходзіць на выраб і транспарціроўку такога посуду, што ўжо казаць пра адходы, якія застаюцца пасля выпітага змесціва.

Каб скараціць колькасць смецця, не абавязкова мяняць свае звычкі, дастаткова іх трохі перагледзець. І для пачатку арганізатары кампаніі прапануюць аматарам гарбаты, кавы і іншых напояў «на вынас» браць з сабой у кафэ шматразовы кубак.

— Адмова ад аднаразовых кубачкаў — гэта яшчэ адзін маленькі крок у межах канцэпцыі «Zero waste» («нуль адходаў»), якую распрацоўвае цяпер Цэнтр экалагічных рашэнняў. Пакуль мы не можам паўплываць на забарону выкарыстання аднаразовага посуду, але спадзяёмся, што наша ідэя дапаможа людзям перагледзець свае звычкі на карысць больш экалагічна дружалюбных, — расказала **адна з арганізатараў кампаніі, супрацоўніца Цэнтра экалагічных рашэнняў Наталля БЛЫШЧЫК.**

Па словах эксперта, экалагічнасць нават папяровых пасудзін для кавы — гэта міф. Такія кубачкі пакрыты знутры поліэтыленавай плёнкай, якую вельмі складана аддзяліць, таму іх у нас у краіне не перапрацоўваюць. Пластыкавыя пасудзіны не толькі не паддаюцца перапрацоўцы, паколькі выраблены з полістыролу (знак «PS» ці лічба 6 у трохвугольніку на ўпакоўцы), але і пры кантакце з гарачымі напоямі лічацца патэнцыйна небяспечнымі.



— Калі вы не ўяўляеце сваё жыццё без пластыкавых кубачкаў, то заўсёды звяртайце ўвагу на маркіроўку, — адзначыла Наталля Блышчык. — ПЭТ-бутэлькі і іншую тару («ПЭТ», «PET», «PETE» або «1» у трохвугольніку), у якую часцей за ўсё наліваюць ваду, катэгарычна забаронена выкарыстоўваць паўторна, бо пачынаецца выдзяленне фармальдэгідфталатавай сумесі. Плюс такога пластыку ў тым, што ён перапрацоўваецца. Самыя небяспечныя як для здароўя чалавека, так і для навакольнага асяроддзя — пасудзіны з полівінілхларыду («ПВХ», «PVC», «V» ці лічба 3 у трохвугольніку). ПВХ да гэтага часу не забаронены для вырабу посуду і харчовай тары, хоць можа выдзяляць таксічныя для арганізма бісфенол А, фталаты, фармальдэгід і вінілхларыд. Да таго ж гэты пластык не перапрацоўваецца. Для шматразовага скарыстання падыходзіць толькі пластык з поліпрапілену («ПП», «PP» ці «5» у трохвугольніку). Ён адносна бяспечны.

Каб ператварыць ідэю ў жыццё, першае, што зрабілі арганізатары, — звярнуліся ў Міністэрства аховы здароўя з пытаннем аб законнасці выкарыстання прынесенага з сабой посуду. Як высветлілася, па санітарных нормах наліваць напоі ў кубак пакупніка не забаронена. Адзінае — посуд павінен быць чыстым і без пашкоджанняў.

Прасіць барыста «У мой кубак, калі ласка!» можна ў любой кавярні. Ёсць ужо і ўстановы, якія актыўна далучыліся да кампаніі. Тут не толькі не адмовяць наліць напой у ваш посуд, але яшчэ і зробяць зніжку. Сёння такіх устаноў — 8, у бліжэйшы час з'явіцца яшчэ 7. З іх некалькі кафэ знаходзяцца ў рэгіёнах. Інфармацыю можна знайсці на сайце кампаніі mycupplease.tilda.ws.

— Мы праводзім інфармацыйную работу, стараемся прыцягнуць да супрацоўніцтва як мага больш устаноў. Вельмі радуе, што многія ўладальнікі кафэ пасля запуску кампаніі самі да нас звяртаюцца. Устаноў, катэгарычна настроеных супраць, мы не сустракалі. Камусьці проста нецікавая гэта тэма, нехта пакуль не ўсведамляе важнасць кампаніі. Усяго два кафэ адмовілі нам, але астатнія настроены пазітыўна, — падзялілася Наталля Блышчык. — Асноўнае наша патрабаванне — каб ва ўстановах вісеў інфармацыйны стэнд. Таксама ў некаторых кавярнях цяпер можна купіць шматразовы кубак (у «меню» з'явілася пазіцыя CupCake).

**Кацярына КІРЭЕВА.**
*katyakireeva@zviazda.by*

***Далучыцца да кампаніі можа кожны. Выкарыстоўвайце свае кубкі і выкладвайце ў сацыяльныя сеткі фота і гісторыі з хэштэгам #my_cup_please і # ka-va_y_кубачак!***

■ Ведай нашых!

# У разведку... па перамогу

**Каманда школьнікаў з Беларусі заняла трэцяе месца на І Міжнародная палявой алімпіядзе юных геолагаў.**

«Юныя геолагі Беларусі» — так называецца каманда вучняў ДУА «Сярэдняя школа №53 г. Мінска», якія сёлета сталі трыумфатарамі ў міжнародным заліку спаборніцтваў. За перамогу ў алімпіядзе, што праходзіла ў сібірскім горадзе Кемераве, змагаліся 35 камандаў і больш за 300 удзельнікаў з шасці краін СНД: Расіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Таджыкістана і Узбекістана.

— Каб наша каманда з годнасцю прадставіла краіну на міжнародных спаборніцтвах, працавала шмат людзей, — расказала **дырэктар філіяла «Інстытут геалогіі» ДП «НПЦ па геалогіі» Вольга БЯРОЗКА.** — Падрыхтавацца і экіпіравацца да алімпіяды школьнікам дапамагалі супрацоўнікі Інстытута геалогіі, геаграфічнага факультэта БДУ, ААТ «Белгорхімпрам», РУП «Белдзяржгеацэнтр», расійская асацыяцыя «Навукова-тэхнічны цэнтр інавацыйнага нетракарыстання».

Пад кіраўніцтвам **загадчыка кафедры глебазнаўства і зямельных інфармацыйных сістэм геаграфічнага факультэта БДУ Дзмітрыя Курловіча і намесніка дырэктара па вучэбнай рабоце ДУА «Сярэдняя школа №53 г. Мінска» Жанны ГВОЗД** школьнікі вывучалі дадатковы матэрыял па геалогіі, трэніраваліся на вучэбнай геаграфічнай станцыі «Заходняя Бярэзіна». Справаздача аб гэтай працы і стала асновай для выканання аднаго з самых складаных спаборніцтваў алімпіяды — «Геалагічнага маршрута».

Лідзіравалі сярод іншых краін «Юныя геолагі Беларусі» і ў заданні «Апісанне геалагічнага помніка». Аб'ектам для сваёй працы яны выбралі помнік прыроды рэспубліканскага значэння «Парк камянёў». Дарэчы, менавіта з яго вывучэння і пачаўся шлях сталічных школьнікаў ад захаплення геаграфіяй да ўдзелу ў Міжнароднай алімпіядзе па геалогіі.

— Мы ішлі ў разведку — каб зразумець, што гэта такое, а атрымалася, сталі пераможцамі, — гаворыць Жанна Гвозд. — Гэты шлях быў даволі складаны: часам пра тое, чым прыйдзецца займацца заўтра, хлопцы і дзяўчаты даведваліся толькі напярэдадні вечарам. Але ў іх была ноч, каб падрыхтавацца да спаборніцтваў, і... здаровая прага да перамогі. Таму ўсё і атрымалася.

Па словах Дзмітрыя Курловіча, каб стаць пераможцам такой алімпіяды, школьных ведаў аб геалогіі мала — патрэбна была практыка на базе галоўнага ВНУ краіны і пастаянная падрыхтоўка ў рэжыме анлайн.

Хлопцам і дзяўчатам так спадабалася ўдзельнічаць у алімпіядзе, што многія члены каманды ўжо гатовыя да новых спаборніцтваў, а некаторыя з іх, напрыклад Арына Мурашова і Юлія Гаўрылюк, нават хочуць звязаць з геалогіяй сваю будучыню.

**Вераніка КОЛАСАВА.** *kolasava@zviazda.by*



Фота Дзяны ЛАЎРЫНОВІЧ.

## ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «ПОКУПКА УДАЧИ 2.0»

Белгазпромбанк
Энергия твоего будущего!

Карта Покупок
КАРТА РАССРОЧКИ БЕЛГАЗПРОМБАНКА

Настоящие правила проведения рекламной игры «Покупка Удачи 2.0» (далее – Правила), направленной на повышение объемов безналичных расчетов с использованием **банковских платежных карточек платежной системы «MasterCard», эмитированных ОАО «Белгазпромбанк» в рамках банковского продукта «Карта покупок»** (далее – карточки «Карта Покупок»), разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 №51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры **«Покупка Удачи 2.0»** (далее – Рекламная игра).

**1. Сведения об Организаторе**

Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «ТриВижн», УНП 190624910, зарегистрировано 19 мая 2005 г. решением Минского городского исполнительного комитета в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №190624910 (далее – Организатор).

Юридический адрес и местонахождение Организатора: 220030, Республика Беларусь, г. Минск, Пр. Независимости, 11/2, офис 328.

1.1.Заинтересованне лицо – ОАО «Белгазпромбанк».

**2. Наименование Рекламной игры:** «Покупка Удачи 2.0».

**3. Территория проведения Рекламной игры:** Республика Беларусь.

**4. Период проведения Рекламной игры:** с 01.09.2017 г. по 19.01.2018 г., включая период розыгрыша и вручения призов.

**5. Комиссия по проведению Рекламной игры:**

Для контроля за ходом Рекламной игры создается Комиссия по ее проведению. Комиссия осуществляет свою деятельность в период проведения Рекламной игры. Комиссия состоит из Председателя и 4 членов.

Председатель Комиссии:

Носик Дмитрий Викторович, директор ООО «ТриВижн».

Члены комиссии:

1. Алехно Наталья Вячеславовна, заместитель директора ООО «ТриВижн»;
2. Лешко Диана Валерьяновна, юрисконсульт ООО «ТриВижн»;
3. Врублевская Ольга Александровна, главный бухгалтер ООО «ТриВижн»;
4. Суходолова Татьяна Михайловна, главный специалист Управления информационной политики ОАО «Белгазпромбанк».

Комиссия осуществляет контроль за соблюдением настоящих Правил проведения Рекламной игры, рассматривает возникшие жалобы и предложения со стороны участников Рекламной игры. Члены комиссии обязаны осуществлять возложенные на них полномочия в течение периода проведения Рекламной игры.

**6. Наименование услуг, в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра:** повышение объемов безналичных расчетов с использованием карточек «Карта Покупок».

**7. Состав и размер призового фонда Рекламной игры и источники его формирования:**

Призовой фонд Рекламной игры составляет сумму в размере **66 501,96 (Шестьдесят шесть тысяч пятьсот один) белорусский рубль 96 копеек,** и формируется за счет денежных средств Заинтересованного лица и состоит из:

| № п/п | Наименование призов, участвующих в розыгрыше | Сумма за 1 ед., бел. руб. | Сумма всего, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1. | Автомобиль RENAULT SANDERO STEPWAY, черный металлик, кузов №X7L5SRAVG58558588 (далее – Автомобиль) | 19 300,00 | 22 167,32 |
| | Денежное вознаграждение | 2 867,32 | |
| 2. | Автомобиль RENAULT SANDERO STEPWAY, серебристый металлик, кузов №X7L5SRAVG58558594 (далее – Автомобиль) | 19 300,00 | 22 167,32 |
| | Денежное вознаграждение | 2 867,32 | |
| 3. | Автомобиль RENAULT SANDERO STEPWAY, серебристый металлик, кузов №X7L5SRAVG58558595 (далее – Автомобиль) | 19 300,00 | 22 167,32 |
| | Денежное вознаграждение | 2 867,32 | |

**8. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится участником Рекламной игры:**

8.1. участниками Рекламной игры могут быть граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь и постоянно проживающие на территории Республики Беларусь, лица без гражданства, которым предоставлен статус беженца в Республике Беларусь и достигшие 18 лет на момент совершения с использованием карточки «Карта Покупок» безналичной операции оплаты товаров (работ, услуг), соответствующей условиям настоящих Правил, и совершившие действия, предусмотренные разделом 9 настоящих Правил.

8.2. Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства, а также Члены комиссии по проведению Рекламной игры.

**9. Для участия в Рекламной игре необходимо в период с 1 сентября 2017 г. по 30 ноября 2017 г. включительно:**

9.1. быть или стать держателем **карточки «Карта Покупок»** платежной системы **«MasterCard»,** эмитированной ОАО «Белгазпромбанк»;

9.2. совершить безналичные операции по оплате с использованием карточки «Карта Покупок» платежной системы «MasterCard» товаров (работ, услуг) в объектах торговли и сервиса, являющихся партнерами ОАО «Белгазпромбанк» в рамках банковского продукта «Карта Покупок», **в период с 01.09.2017 г. по 30.11.2017 г. на общую сумму безналичных операций не менее 600,00 (шестьсот) белорусских рублей,** при этом сумма каждой безналичной операции должна быть не менее **30,00 (тридцать)** белорусских рублей**;**

9.3. заполнить регистрационную форму на интернет-сайте kartapokupok.by (далее – Сайт), указав:

1. фамилия, имя и отчество участника Рекламной игры;
2. почтовый адрес участника Рекламной игры (почтовый индекс, область, населенный пункт, улица, дом, корпус (при наличии), номер квартиры (при наличии);
3. личный номер телефона в формате – код оператора или междугородний телефонный код населенного пункта, номер абонента (пример: +375297896367, где 29 – код оператора (населенного пункта), а 7896367 – номер абонента, без пробелов и символов);
4. адрес электронной почты (e-mail) (при наличии);
5. данные о безналичной операции;

а) дата операции (дата совершения безналичной операции – согласно соответствующему карт-чеку);

б) код авторизации безналичной операции (код авторизации, подтверждающий осуществление банком-эмитентом авторизации. Состоит из 6 цифр и печатается на карт-чеке);

в) последние четыре цифры номера карточки «Карта покупок», с помощью которой была совершена безналичная операция:

г) сумма безналичной операции.

6. Ознакомиться с настоящими Правилами проведения Рекламной игры, поставив галочку об ознакомлении с Правилами проведения Рекламной игры и о согласии на участие в Рекламной игре в регистрационной форме.

9.4 Каждой зарегистрированной безналичной операции с использованием карточки «Карта покупок» номиналом свыше 30,00 белорусских рублей присваивается номер участника (дата + код авторизации безналичной операции + последние 4 цифры номера карточки «Карта покупок»), при условии совершения участником Рекламной игры с использованием карточки «Карта Покупок» безналичных операций на общую сумму не менее 600,00 (шестьсот) белорусских рублей. Данный номер участника Рекламной игры и есть основание для участия в розыгрыше призов при соблюдении участником Рекламной игры условий настоящих Правил.

**10. Обязательные условия участия в Рекламной игре.**

10.1 Соблюдать нормы законодательства Республики Беларусь и правила пользования банковскими платежными карточками, установленными банком-эмитентом.

10.2 Сохранять до выдачи призов оригинал карт-чека, подтверждающего факт совершения безналичных операций с использованием карточки «Карта покупок».

10.3 Регистрация новой безналичной операции с использованием карточки «Карта покупок» осуществляется через заполнение новой регистрационной формы на Сайте.

10.4 Повторная регистрация одной и той же безналичной операции с использованием карточки «Карта покупок», которая содержит одинаковые данные по таким полям, как «Код авторизации» и «Последние 4 цифры номера карточки «Карта покупок» не допускается.

10.5 Не допускаются к участию в Рекламной игре безналичные операции:

- которые не зарегистрированы на Сайте;
- которые совершены с использованием карточки «Карта покупок» **до** 00 часов 00 минут 01.09.2017 г. или **после** 23 часов 59 минут 59 секунд 30.11.2017 г.;
- которые относятся к операциям по пополнению счета;
- которые совершены с использованием карточек «Карта покупок», эмитированных в рамках других платежных систем;
- если денежные средства, перечисленные в рамках безналичной операции, в период с 01.09.2017 по 30.11.2017 были возвращены участнику Рекламной игры ее партнерами ОАО «Белгазпромбанк» в рамках банковского продукта «Карта Покупок».

10.6 В Рекламной игре можно принимать участие неограниченное количество раз при выполнении условий Рекламной игры, предусмотренных настоящими Правилами.

**11. Порядок розыгрыша, уведомления Победителей о результатах розыгрыша и вручения призов.**

11.1 Розыгрыш призов состоится 11 декабря 2017 г. в присутствии комиссии по проведению Рекламной игры в 10.00 по адресу: Республика Беларусь, РУП «Отель «Минск», г. Минск, пр. Независимости, 11/2, конференц-зал, среди участников Рекламной игры, выполнивших условия настоящих Правил.

11.2 Розыгрыш призового фонда проводится открыто с возможностью присутствия на нем участников Рекламной игры. Результаты розыгрыша Рекламной игры не должны зависеть от воли Организатора и не могут быть никем специально устроены.

11.3 Определение участника Рекламной игры, выигравшего один из призов (далее – Победитель), происходит следующим образом:

- организатор оформляет на каждый номер участника Рекламной игры карточку, которая содержит присвоенный при регистрации номер и ФИО участника;
- в момент розыгрыша карточки помещаются в лототрон;
- член комиссии раскручивает лототрон и путем случайного выбора карточки участника Рекламной игры определяет Победителя. Таким образом, определяется три Победителя, которые получат по одному автомобилю.

Таким же образом последовательно выбирается резервный список Победителей, состоящий из 2 карточек участников Рекламной игры. Очередность резервных Победителей устанавливается последовательно по мере их определения в порядке, установленном настоящим пунктом Правил.

Призовой фонд разыгрывается в последовательности, указанной в пункте 7 настоящих Правил.

11.4 Победители уведомляются Организатором письменно заказным письмом с уведомлением до 14 декабря 2017 г., а также по электронной почте (в случае ее указания в регистрационной форме) и по телефону (звонок либо СМС-сообщение) до 14 декабря 2017 г.

11.5 Торжественное вручение призов Победителям состоится 20 декабря 2017 года в 10.00 по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2.

В случае отсутствия Победителя в день торжественного вручения, выдача призов проводится в срок с 20.12.2017 г. по 27.12.2017 г. по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ООО «ТриВижн», г. Минск, пр. Независимости, 11/2, каб. 328. Для получения призов Победителю необходимо предварительно связаться с представителем Организатора с 20.12.2017 г. по 27.12.2017 г. включительно по телефону +375 17 209 90 03.

11.6 Для получения приза необходимо предъявить:

- документ, удостоверяющий личность (паспорт или вид на жительство);
- карточку «Карта Покупок» платежной системы «MasterCard», с помощью которой была проведена безналичная операция;
- оригинал чека (или документ из банка, подтверждающий безналичные операции), который остается у Организатора Рекламной игры.

11.7 В случае если с Победителем Рекламной игры не удается связаться и уведомить о выигрыше из-за некорректных данных, указанных при вводе на интернет-сайте **kartapokupok.by** либо по телефону, указанному при регистрации, либо Победитель письменно отказался от приза, либо не представил необходимые подтверждающие документы, указанные в настоящих Правилах, то право на получение приза переходит к Победителю из резервного списка, сформированного при розыгрыше Призов.

11.8 Победители Рекламной игры из резервного списка извещаются о выигрыше способом, описанным в п. 11.3 настоящих Правил.

Первый резервный Победитель извещается о выигрыше в течение 2 дней со дня признания его Победителем, но не позднее 29 декабря 2017 года.

Для получения приза первый Резервный Победитель из резервного списка, должен до 03.01.2018 г. включительно явиться по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ООО «ТриВижн», г. Минск, пр. Независимости, 11/2, каб. 328, предварительно связавшись с представителем Организатора по телефону +375 17 209-90-03. При себе иметь документы, указанные в п. 11.6 настоящих Правил.

В случае если до 03.01.2018 г. с первым Резервным Победителем Рекламной игры не удается связаться и уведомить о выигрыше из-за некорректных данных, указанных при вводе на интернет-сайте-kartapokupok.by, либо по телефону, указанному при регистрации, либо первый Резервный Победитель письменно отказался от Приза, либо не представил необходимые подтверждающие документы, указанные в настоящих Правилах, то право на получение Приза переходит ко второму Резервному Победителю из резервного списка, сформированного при розыгрыше Приза.

Второй Резервный Победитель извещается о выигрыше в течение 2 дней со дня признания его Победителем, но не позднее 05 января 2018 года.

Для получения приза второй Резервный Победитель из резервного списка, должен до 19.01.2018 г. включительно явиться по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ООО «ТриВижн», г. Минск, пр. Независимости, 11/2, каб. 328, предварительно связавшись с представителем Организатора по телефону +375 17 209 90 03. При себе иметь документы, указанные в п.11.6 настоящих Правил.

11.9 Призы не подлежат замене. Выплата денежного эквивалента Призов не осуществляется.

11.10 Организатор не оплачивает Победителям расходы, связанные с проездом к месту получения призов.

11.11 Организатор не занимается доставкой призов Победителям.

11.12 При получении призов Победители несут все права и обязанности по уплате подоходного налога в бюджет Республики Беларусь. Начисление, удержание и перечисление подоходного налога проводится в порядке, установленном Особенной частью Налогового кодекса Республики Беларусь и осуществляется Организатором. Удержание с Победителей подоходного налога, исчисленного Организатором в соответствии с законодательством Республики Беларусь, производится Организатором (выступающим налоговым агентом) в момент выдачи приза из денежной части приза (денежная часть приза удерживается Организатором для уплаты подоходного налога в установленном размере).

11.13 Победители, претендующие на получение призов, обязуются заполнить и подписать все необходимые для их получения документы, представляемые Организатором, выполнить все условия, предусмотренные настоящими Правилами, а также иные формальности, необходимые для получения призов.

11.14 В случае если Победитель (или резервный Победитель) не может получить приз лично, приз может получить его доверенное лицо, предоставив лично доверенность от Победителя (или резервного Победителя) на получение приза, заверенную нотариально, и документы согласно условиям настоящих Правил.

11.15 Победитель, в том числе резервные, теряет право получения приза, в случае если:

- отказался от получения приза, о чем письменно известил Организатора Рекламной игры, по адресу 220034, Республика Беларусь, г. Минск, пр. Независимости 11/2, офис 328;
- указал недостоверную информацию при регистрации на Сайте;
- не представил необходимые подтверждающие документы, указанные в настоящих Правилах, в сроки и в порядке, установленные настоящими Правилами;
- не явился для получения приза в сроки, установленные настоящими Правилами.

11.16 Победитель при получении приза письменно подтверждает факт его получения и заполняет все необходимые документы, представленные Организатором и связанные с получением приза.

11.17 Ответственность Организатора по выдаче призов ограничена исключительно вышеуказанным количеством и видами этих призов.

11.18 В случае невыполнения Победителями настоящих Правил в выдаче приза может быть отказано.

**12. Наименование печатного издания средства массовой информации для публикации Правил и результатов розыгрыша, сроки публикации.**

12.1 Правила Рекламной игры подлежат публикации в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.

12.2 Результаты розыгрышей Рекламной игры подлежат публикации в газете «Звязда» не позднее 15.01.2018 г.

**13. Права и обязанности участников Рекламной игры.**

13.1 Принимая участие в Рекламной игре, участники Рекламной игры подтверждают свое ознакомление и согласие со всеми условиями настоящих Правил, а также принимают на себя обязательство выполнять все требования настоящих Правил и законодательства Республики Беларусь, вытекающие из участия в Рекламной игре и/или связанные с получением призов.

13.2 Факт участия в Рекламной игре подразумевает, что ее участники соглашаются с тем, что в рамках данной Рекламной игры их имена, фамилии, отчества, фотографии, аудио и видео интервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в рекламных целях, связанных с проведением и результатами данной Рекламной игры, в том числе по радио, телевидению, в глобальной компьютерной сети Интернет и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты им какого-либо вознаграждения в рамках данной Рекламной игры. Все права, в том числе исключительные имущественные права, на такие интервью и результаты съемки будут принадлежать Организатору.

13.3 Участники Рекламной игры при заполнении регистрационной формы на Сайте обязаны вводить достоверную информацию. Организатор не несет ответственности за достоверность данных, внесенных участниками Рекламной игры в регистрационную форму, а также за последствия внесения участником Рекламной игры недостоверной информации в регистрационную форму.

**14. Порядок предоставления информации по вопросам проведения Рекламной игры.**

14.1 Все возможные вопросы и претензии участников в отношении организации и условий передачи Призов должны быть адресованы Организатору Рекламной игры по адресу: 220030, Республика Беларусь, г. Минск, пр. Независимости, 11/2, офис 328.

14.2 Информацию об условиях участия и проведения Рекламной игры можно получить по телефону 120, а также на сайте kartapokupok.by.

14.3 Организатор не вступает в споры между участниками Рекламной игры относительно определения собственника выигранного приза и/или претендентов на получение приза.

14.4 Организатор не несет ответственности за качество работы почтовых служб, в частности за недоставку либо несвоевременную доставку почтовой корреспонденции.

14.5 В случае если призы не получены в соответствии с настоящими Правилами и сроками настоящей Рекламной игры, либо не удается связаться с Победителями и уведомить их, из-за некорректных данных, внесенных ими при регистрации в Рекламной игре, призы остаются в распоряжении Организатора.

**15. Иные условия.**

15.1 Споры между Организатором и участниками Рекламной игры рассматриваются согласно законодательству Республики Беларусь.

**Правила размещены на сайте kartapokupok.by и по телефону 120**

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3077 от 24.08.2017, выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь

■ Паралельнае жыццё

# УТУЛЬНЫ ПОРЦІК

*Мне давялося пазнаёміцца з архітэктурай палаца князёў Друцкіх-Любецкіх у Шчучыне не толькі дзякуючы таму, што часта бываю там, але і праз паралелі гістарычнага артыкула польскага вучонага Рамана Афтаназы. Усё сыходзілася: мураваны двухпавярховы будынак на высокім цокалі, «тры ўзаемна звязаныя аб'ёмы, сярэдні, злёгку адсунуты ўнутр аб'ём, быў ніжэйшы, чым бакавыя, і ствараў на галоўным фасадзе порцік». Шырокія ўваходныя дубовыя дзверы, а па баках яшчэ больш шырокія, амаль квадратныя вокны. Глядзіш праз двайное шкло ўвечары, а агнёў на вуліцы ці не ў чатыры разы больш звычайнага. З каментарыем усяго гурвасткасць гмаху ўражвае яшчэ больш. Сцены вялікага салона аздоблены дубам. Праўда, кудысьці знік у «перабудовачны час» польскі паркет, паскрыпванне якога пад нагой павявала б былліннасцю. Злева плітачна-металічная лесвіца вядзе на другі паверх, на яе месцы зноў-такі некалі была дубовая, а пад ёй — княжыя ванны. Жырандолі не жырандолі, а масіўныя сучасныя свяцільнікі, заказаныя ў Мінску, звісаюць з высачэзных столяў і высвечваюць, здаецца, моманты далёкай гісторыі. Уражвае сваім інтэр'ерам дабудаваная пасля вайны актавая зала. Усё сыходзіцца. І толькі княжая бібліятэка ды архіў княжага роду знаходзяцца, на жаль, у Кракаве.*



— А не страшна ноччу? — пытаюцца амаль усе госці палаца. Так, да трэскаў, піскаў, адным словам, «дыханне» дубовых сцен трэба прывыкнуць, вывучыць іх, бо яны маюць здольнасць, як і кожнае дрэва, усыхаць, набрыняваць. Па трубасцёках амаль заўсёды імкне вада — ці дождж, ці аселая вільгаць. А гукі падзення кропляў з другога паверха на сучасныя пластыкавыя навесы над уваходамі ў цокальныя памяшканні падобныя на выбухі петардаў.

Высокія столі, амаль метровай таўшчыні сцены палаца, адумысная планіроўка напаўняюць памяшканне дзівосным рэхам нават пры дыханні. Гаварыць на адлегласці двух метраў у незапоўненай парадный зале амаль немагчыма. Кашлянеш — здаецца, увесь горад чуе.

А наогул, з кожным жылым памяшканнем патрэбна пасябраваць. І, калі нават апоўначы з'явіцца да цябе князь ці княгіня, неабходна ведаць іх імя і інтарэсы. Яны любілі, як князь Францішак Ксаверый, сваё далёкае Вялікае Княства Літоўскае. Ён марыў разам з кампазітарам і сваім сябрам Міхалам Агінскім пад апекай рускага цара аднавіць сваю недалёкую па часе дзяржаву. Утопія. Складзены ім праект проста не спатрэбіўся, бо пачалася вайна з Напалеонам, калі ніводзін беларускі князь не мог вызначыцца, якому Богу маліцца. А з'явіцца ў палацы нястомны аматар хуткай язды на аўтамабілі князь Уладзіслаў, з ім можна пагаварыць пра сучасны і тагачасны «фольксфаген». Графіня Марыя, будучая жонка Францішка, часта бегала да невялічкага азярца, якое знаходзіцца каля сучаснага скрыжавання Савецкай і Астроўскага. Трэба ж, нарэшце, высветліць, пазначаў князь сваіх рыбак залатым кольцам ці не. Усё ж вялікі клопат, калі наступае нераст.

Па начах асабліва плённа думаецца пра дзённыя сустрэчы.

— А Чорная нясвіжская Дама не прыходзіць часам? — пытаецца адна сучасная брунетка-князёўна, відаць, аматарка даўніх легендаў.

Але ж гэта не яе ўладанні. Прыходзяць тутэйшыя. Такі, напэўна, жаночы лёс, што ўсе яны бываюць пакрыўджанымі каханнем. Князёўна Аліна, праўнучка Францішка, пакахала гальшанскага князя Ануфрыя. Яны сустрэліся на адным з віленскіх баляў. Усё адбылося імгненна. Танец, некалькі высокіх інтымных слоў. Тэрасны парк. Нават пацалунак. Тагачасныя абяцанні памятаць і думаць, напэўна, значылі больш, чым сёння. Наступны раз яны ўбачыліся ўжо ў Гародні, у Старым Замку, праз паўгода. Ён — у чорным вячэрнім фраку і яна ў бялюткай бальнай сукенцы — зbeгли па крутой дубовай лесвіцы ўніз да Нёмана і каталіся на лодцы. Развіднела. Іх аднесла ўніз па цячэнні. У палацы — перапалох. Калі закаханую пару знайшлі, госці без лішніх слоў вырашылі асноўнае пытанне — вяселле. Але — першая руская рэвалюцыя. Князь Ануфрый, захоплены гісторыяй дзекабрыскага руху, часова ў Пецярбургу. А потым вязнем — у Сібіры. Аліна нават не ведае, што з ім здарылася. Колькі ні пасылалі да яе сватоў — адмаўляла. Вось яна праз шмат гадоў, спакойная, сумная, у палацы сваіх продкаў. Я таксама маўчу. Князёўна падымаецца з майго нязвыклага для яе крэсла, высокая, стройная, цёмнавалосая, з правільным прывабным профілем, здаецца, у той самай бальнай сукенцы, ідзе праз шырокія дзверы. І толькі чуецца паскрыпванне прыступак пад яе лёгкімі крокамі. Лесвіцы, па якой пайшла князёўна, я чамусьці не памятаю, не ведаю. Хочацца кінуцца ўслед, але крокі сціхаюць, і дарэмна гарыць у маіх напружаных руках кішэнны ліхтарык.

Аднойчы пад вечар усчаўся парывісты заходні вецер. Звонку аб сцены палаца і калоны порціка білася, свісталі яго вар'яцкія парывы. Здавалася, канца яму не будзе. Але апоўначы вецер нібы ўлёгся ў кронах бліжэйшых клёнаў і бяроз. Неба праяснілася, і нават выглянулі зоркі. Людзі ўжо не ішлі дарожкамі паўз палац, з цікаўнасцю заглядваючы на высокія акаціцы, як днём.

Раптам за шыбамі прыцемненых акон аднекуль выбілася свячэнне, якое дробненька мільгацела на фоне начнога неба, быццам трапяталі белыя крыльцы цёмнага дзіцячага сілуэта. Воблік заплыў у аконнае святло, і вырысаваўся зусім юны тварык, абрамлены кучаравымі русымі валасамі. Ужо праступіла светлае адзенне, што закрывала, як стыхар, увесь сілуэт хлопчыка. Над галоўкай выразна свяціўся німб. Гэта ж анёлак!

Нас падзялялі ўсяго два тонкія шкельцы. Несумненна, анёлак мяне бачыў, ён узмахнуў крыламі і апынуўся каля самай балюстрады. Што было б далей — невядома, каб ён не загаварыў. Голасу не чулася, але — дзіўна — я разумеў яго па руху вуснаў:

— Я служу Богу-лекару. Непадалёк адсюль даўным-даўно стаяў маёнтак. Я памятаю сваіх родных і час ад часу малюся за Шчучын.

Хутчэй ад страху няясна гучала-прыпаміналася старабеларуская гаворка ліцвінаў, на якой гаварыў анёлак.

— А ты па якой графскай лініі знаходзішся ў сценах палаца? — ужо на чыстай беларускай мове прадаўжаў анёлак-збаўца.

Што я мог сказаць у апраўданне. Ні гаспадар, ні арандатар, ні... «Ахоўнік мінуўшчыны» падыходзіла найлепш, і дзіцячы тварык асвяціўся ўсмешкай.

— Я ўвасобіўся ў цела маленькага графа, які тут загінуў, калі ўпаў з каня пасля выбуху шведскага снарада тры стагоддзі таму. Я сышоў на зямлю, каб пазбавіць болю маці таго хлопчыка, якая праз усё жыццё пакутуе і кляне сябе за смерць малога графа, бо адпусціла яго аднаго пакатацца. Вінаваты ж ворагі, што прыйшлі на нашу зямлю. Я дапамагу і табе, — працягваў анёлак. — Да сустрэчы.

Анёлак узмахнуў белымі крыламі — я іх бачыў выразна, бо прасвятлела раніца — і без прыкметных намаганняў знік за магутнымі калонамі.

...Нечакана пусціўся густы дождж. І набралася пад дахам палацавага порціка добра-такі людзей. Асабіста мне гэта затуленая з трох бакоў і прыкрытая зверху галерэя падабаецца, сюды бягуць схавацца часта. Тлумачу, што ад непагадзі беражэ маіх гасцей порцік, каляровая плітка якога памятае яшчэ крокі былых гаспадароў.

— Утульны порцік, — заключае адзін з пацярпелых ад дажджу. І я згаджаюся: утульны. Тым больш з кветкамі, якія раскашуюць на жалезных кованках і ў час вячэрняга дажджу пахнуць асабліва духмяна аж з мінулых княжых вякоў, калі жыла і кахала юная Марыя, калі вяртаўся князь Друцкі-Любецкі з усіх еўрапейскіх сталіц у свой ціхі Шчучын, каб паматіцца ў касцёле Святой Тэрэзы за сваю Айчыну.

**Рычард БЯЛЯЧЫЦ.**
**Фотакалаж**
**Людмілы Немны**

■ Дзела памяці

# ЗЛАМАНЫЯ ГАЛІНКІ — ГЭТА ЗАГУБЛЕНЫЯ ЖЫЦЦІ

**У Навагрудку, на ўваходзе ў «Сад справядлівасці і міласэрнасці», які знаходзіцца на тэрыторыі музея яўрэйскага супраціўлення, установяць памятны знак. На ім будзе фігура загінулай там дзяўчыны Міхле Сасноўскай, якая сімвалізуе ўсіх загінулых дзяцей. За ёй зробяць дрэва жыцця. На ім будуць бачныя зламаныя галінкі — гэта загубленыя жыцці. Эскіз помніка распрацаваны дзякуючы фінансаванню мясцовага жыхара Сяргея Коваля.**

Міхле Сасноўскай было 12 гадоў, калі яна трапіла ў гета. Удалося ўцячы, але затым яе арыштавалі і закатавалі.

Як расказвае **загадчык сектара культуры аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Навагрудскага райвыканкама Наталля ЖЫШКО,** яшчэ ў 1990-я гады ў Навагрудак прыязджаў Джэк Каган, адзін з былых вязняў гета. На яго вельмі моцнае ўражанне зрабіў горад, дзе ён перажыў шмат цяжкасцяў, — і ён нават не змог тут доўга знаходзіцца.

— У першыя дні вайны, у будынак былога ваяводскага суда, які знаходзіцца на вуліцы Мінскай, 64, сагналі больш як 6000 чалавек, — расказвае Наталля Жышко. — Іх цэлы дзень трымалі на вуліцы, а пасля пусцілі ў гэта памяшканне. Людзей раздзялілі на дзве часткі: трэба было назваць прафесію і колькасць дзяцей. Хоць Каган кажа, што насамрэч гэта было не галоўным. Проста трэба было ўсіх размеркаваць. Адных адразу вывезлі і расстралялі. А другіх пакінулі ў гета, адправілі на работы. Умовы там былі надзвычай цяжкія.

Спачатку ў Навагрудку дзейнічала два гета. А затым, пасля масавых расстрэлаў, засталося адно. Яно было абнесена высокім плотам, за людзьмі пільнавалі. Натуральна, найбольш цярпелі дзеці і жанчыны.

На адкрыццё музея, а таксама і цяпер прыязджаюць тыя, хто быў у гета або іх нашчадкі з усяго свету — з Ізраіля, з ЗША і з іншых краін. Музей яўрэйскага супраціўлення ў Навагрудку досыць наведвальны, уключаны многімі фірмамі ў турыстычныя маршруты.

У гэтым горадзе адбылі адны з паспяховых уцёкаў яўрэяў. Вязні, якія заставаліся ў гета, пачалі капаць тунэль, вывозілі з яго зямлю, трамбавалі яе, хавалі дзесьці. А затым уцяклі. На тым месцы, дзе яны зрабілі выхад з гета, пасаджаны сад, добраўпарадкавана тэрыторыя, плануецца пабудаваць «сцяну памяці». Там будзе расказвацца пра гісторыю Вялікай Айчыннай вайны і, канкрэтна, пра трагедыю яўрэйскага народа на Навагрудчыне.

— І мы кажам пра тое, што музей яўрэйскага супраціўлення — гэта не музей смерці. Так, там загінула шмат людзей. Але некаторыя, на шчасце, дзякуючы падтрымцы мясцовага насельніцтва засталіся ў жывых, — адзначае спадарыня Наталля. — Мы разумеем, што людзі, якія падтрымлівалі яўрэяў, рызыкавалі і сваім жыццём, і жыццём сваёй сям'і. Дзякуючы мясцовым жыхарам, дзякуючы партызанскаму атраду Бельскіх на Навагрудчыне самая вялікая колькасць яўрэяў, што ацалелі. Калі ў суседніх краінах, напрыклад у Літве гэта 1%, у Польшчы 2—3%, то на Навагрудчыне гэта 10% (ад агульнай колькасці тых, што пражывалі да вайны). А па Беларусі гэта лічба складае дзесьці 5%.

Памятны знак ужо атрымаў зацвярджэнне мастацка-экспертнага савета ў Гродне. Цяпер над ім працуюць скульптары і архітэктары. Адкрыццё, папярэдне, запланавана на 26 верасня.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*
*Навагрудскі раён*



Пантэон Айчыны

# ЯГАЙЛА

## (1363 (?) — 1434)

Пэўна, не маюць рацыі тыя гісторыкі і даследчыкі мінулага, якія даюць рэзка адмоўныя ацэнкі Ягайлу, як і тыя, хто ўсхваляюць яго. Адны бачаць у асобе Ягайлы здрадніка праваслаўнай веры і радзімы, які з-за ўлады забіў свайго родзіча Кейстута, аддаў за польскую карону палякам Літву, а іншыя ўзносяць яго як мудрага караля. Пры ўсім аўтарскім суб'ектывізме паспрабуем зірнуць на Ягайлу ягонымі вачыма, зразумець яго.

Ужо ў пачатку свайго праўлення юны Ягайла (яму было каля 15 гадоў) апынуўся ў надзвычай цяжкіх умовах. Старэйшыя зводныя браты ад Марыі Віцебскай не прызнавалі яго ўлады. А полацкі князь Андрэй увогуле ад'ехаў у Маскву і намовіў маскоўскага князя да паходу на ВКЛ, падчас якога іншы Альгердавіч, Дзмітрый, здаў свае вотчыны Старадубкі і Трубчэўск.

У адрозненне ад старэйшых Альгердавічаў, малодшыя (ад другой Альгердавай жонкі Уляны Цвярской) засталіся без удзельных княстваў, а значыць і без палітычнай вагі. Магчыма таму, каб падтрымаць іх, Альгерд і перадаў велікакняжацкі пасад свайму любімцу Ягайлу.

Калі аналізаваць раннюю палітыку Ягайлы, робіцца відавочным, што яна была скіравана на ліквідацыю Троцкага княства і знішчэнне Кейстута і ягоных сыноў, а пасля чарга дайшла б і да старэйшых Альгердавічаў. Такі злахітры план магла прыдумаць толькі дзеталюбная маці, якая ўсялякімі сродкамі хацела ўладкаваць сваіх сыноў, не дацо іх у крыўду, не дазволіць стаць ізгоямі. Па натуры прастадушны і мяккацелы, Ягайла міжволі падначальваўся ёй, а справы за яго рабіў старэйшы брат, разумны і дзейсны Скіргайла — Іван. Менавіта яны з дапамогай крыжакоў і распрацавалі план адхілення Кейстута ад дзяржаўных спраў і ўвогуле яго фізічнай ліквідацыі. Ягайла паслухмяна ішоў за імі. Магчыма, Кейстута забілі без Ягайлава ведама, па загадзе Скіргайлы, Ягайла ўсяляк выракаўся забойства Кейстута, не даваў згоды на расправу з Вітаўтам, з якім сябраваў. Не здзіўляе, калі ўся камбінацыя з Вітаўтам (яго ўцёкі з Крэўскага замка ў Ордэн) была ажыццёўлена крыжакамі з мэтай развязаць у ВКЛ дынастычную вайну, што ім і ўдалося.

Матчыным уплывам можна растлумачыць і саюз у 1380 годзе Ягайлы з татарскім цемнікам Мамаем супраць Масквы. Хто-хто, а Уляна Цвярская марыла адпомсціць Маскве за заваяванне Цверы, дапамагчы свайму брату ў барацьбе з ёй. А Ягайлу трэба было вярнуць Старадубі і Трубчэўск, чаго ён і дамогся, не ўступаючы ў бой з войскам Дзмітрыя Данскога. Нібыта Ягайла спазніўся на Кулікоўскую бітву, а сапраўды за гэтай палахлівай асцярожнасцю хаваўся хітры разлік: аслабіць ва ўзаемнай бітве абодва бакі, а пасля скарыстацца яе вынікамі. Гэтым уменнем выкарыстоўваць чужы плён Ягайла авалодае дасканала, толькі трэба было ўмець дачакацца свайго часу, і ён чакаў.



Вайна з Вітаўтам (а па сутнасці з Ордэнам, які яго падтрымаў) у 1383—1384 гадах назаўжды змяніла палітычнае становішча не толькі Ягайлы, які памірыўся з Вітаўтам, але і ўсяго ВКЛ.

Ягайла, зразумеўшы хісткасць свайго становішча на велікакняжацкім пасадзе не ўмацаваў яго, а вырашыў перасесці на каралеўскі пасад Польшчы. І калі ў 1385 годзе палякі прапанавалі стаць іх каралём пры ўмове жаніцьбы з дачкой польскага караля Людовіка Венгерскага (таго самага, якое правеў Кейстут), Ядвігай, заключыць унію ВКЛ з Польскім каралеўствам, хрысціць у каталіцтва паганцаў Літвы, Ягайла пагадзіўся. Спрэчкі аб матывах заключэння 14 лютага 1385 года Крэўскай уніі працягваюцца і цяпер. Можна прызнаць, што Ягайла не ўстаяў перад спакусай быць каралём. А хто адмаўляўся добраахвотна ад каралеўскай кароны? Ён умацаваў сваё асабістае



становішча, але не забываў і пра інтарэсы Літвы. У саюзе з Польшчай ён бачыў залог узвышэння і ВКЛ. Не думаю, што ён свядома даў згоду на ўваходжанне ВКЛ у Польскае каралеўства. Відавочна, ён стаў ахвярай польскіх інтрыг, не разабраўшыся ў лацінскім тэрміне «applicare», які азначаў «нешта далучыць» і «з нечым аб'ядноацца». Палякі тлумачылі гэты тэрмін як далучэнне ВКЛ да Польскага каралеўства і ўсімі праўдамі і няпраўдамі дамагаліся яго ажыццяўлення. Ці мог Ягайла прадбачыць, што Крэўская унія прывядзе праз два стагоддзі да дзяржаўнай смерці ВКЛ? На жаль, ён не быў празарліўцам.

Зрэшты, не трэба забываць і яго апостальскую місію па хрышчэнні Літвы. Хоць вынікі яе досыць сціплыя, было ахрышчана каля 30 канагаў і тое ў радавых уладаннях Ягайлы, а не ўва ўсёй дзяржаве, заснавана Віленскае біскупства і пабудавана 7 касцёлаў, у тым ліку ў Крэве, Гайне і Абольцах. Тым самым ВКЛ ужо не лічылася дзяржавай паганцаў, і Ордэн пазбавіўся ідэалагічнага апраўдання сваёй агрэсіі. У 1392 годзе Ягайла пасля крывавай барацьбы з неўтаймаваным Вітаўтам перадаў яму ў кіраванне ВКЛ, захаваўшы за сабой вярхоўную ўладу пад тытулам «вярхоўны князь Літвы».

З усіх яго спраў як польскага караля перш за ўсё адзначым перапарэнне Кракаўскага калегіума ва ўніверсітэт — адзіны асветніцкі цэнтр такога высокага ўзроўню на ўсходзе Еўропы. Па праве ўніверсітэт называецца Ягелонскім. Польшча павінна быць удзячна гэтаму «дзікуну», што ён выратаваў яе ад нямецкага засілля і лацінавізацыі. Сам факт, што Ягайла размаўляў па-беларуску, і гэтая мова загучала на кракаўскім двары, прымусіла моцна знямечаных палякаў шанаваць сваю мову. А візантыйскія мастацтвы русінаў, якія распісвалі польскія касцёлы, падарвалі панаванне змрочнай готыкі. Сам просты выгляд Ягайлы, які не любіў упрыгожанняў, прастата ў абыходжанні, адсутнасць самалюбства і фанабэрыстай знявагі да людзей, шчодрасць і міласэрнасць, нібыта вярталі польскі двор да часоў першых каралёў, напаўнялі яго атмасферу свежым подыхам маладосці, а не цырымоніямі і рытуальнымі ўмоўнасцямі.

За польскімі справамі Ягайла не забываў пра родную Літву і ўсяляк дапамагаў ёй, за што і дакаралі яго палякі. Хоць і не даў Вітаўту згоды быць каралём Літвы, баючыся страціць яе назаўжды для сваіх сыноў Уладзіслава і Андрэя Казіміра.

На старасці гадоў ад чацвёртай жонкі Соф'і Гальшанскай у яго нарадзіліся спадкаемцы (хоць падазравалі, што гэта дзеці палюбоўнікаў каралевы). Як добры бацька, ён хацеў забяспечыць сваіх сыноў усім неабходным. Адсюль і ўступкі польскай шляхце, за прызнанне ягоных сыноў спадкаемцамі польскай кароны.

Часам Ягайла выглядае гэткім беларускім дзецюком на польскім пасадзе. Сучаснікаў здзіўлялі яго простанародныя звычкі, прымаўкі, прастадушная шчырасць. Пэўна, ён і сам быў не рады, што атрымаў ад Бога такую высокую ўладу. Некалькі разоў парываўся скласці з сябе каралеўскую карону, што яму не далі зрабіць. Прості кароль задавальняў як шляхту, так і народ. А ён глядзеў на ўладу, як на цяжар, што яму наканавана несці па жыцці і скардзіўся на свой лёс: «Так шмат мяне абцяжарвае гэтае зямное каралеўства, якое я маю, як пыл пад маімі нагамі». І каб гэта зразумець, трэба было пражыць такое доўгае жыццё.

**Віталь ЧАРОПКА.**

■ Сваімі словамі

# СІЛА РОДУ. І СЛАБАСЦЬ ЗАБЫЦЦЯ



## Чаму сямейны альбом — пусты?..

**Ведаеце што. Маладое пакаленне рызыкуе застацца без сямейнага фотаальбома. Чаму? Ды так павялося, што чым больш здымкаў ствараецца ў нашу лічбавую эру, тым менш іх асядае на паперы... Ці не захоўваецца зусім. Кілабайты, мегабайты, гігабайты віртуальнай памяці запаўняюцца. Ды толькі сямейны альбом застаецца пустым.**

Неяк чула ад аднаго знаўцы, што, каб не згубіць здымкі (якія знаходзяцца ў памяці камп'ютара), трэба загрузіць іх у сецiва. А там ты іх абавязкова знойдзеш, калі будзе патрэбна. У нечым гэта праўдзіва: на камп'ютары ці на флэшцы можна выдаліць пэўную папку, будучы ўпэўненым, што яна захоўваецца дзесьці яшчэ. І толькі пасля высвятляецца, што і ў іншым месцы здымкі сцёртыя, калі там наводзіўся парадак... А ў сеціве фотавыявы, калі яны табе падабаюцца, нібы жывуць вечна. Ды толькі ідуць дні, месяцы, гады — жаданы кадр далей і далей хаваецца ў віртуальную прастору. І знайсці яго робіцца ўсё складаней: гартаць стужку даводзіцца даўжэй. А што, калі старонку атакуе вірус?.. Згубіш не толькі фрэндаў, але і ўсе свае «разумныя допісы», і, натуральна, фотаздымкі. Шкада будзе, ох як шкада.

Бабуля неяк пыталася, ці ёсць у мяне прыгожыя здымкі ў такім, маладым узросце? Каб праз шмат гадоў імі любавацца. Я адказала, што здымкаў вельмі шмат. Бабуля супакоілася. Затое я наадварот, пачала крышачку хвалявацца. Бо ўсе яны знаходзяцца дзесьці ў розных папках і профілях. А раздрукаваных — лічаныя адзінкі!

На шчасце, на адным з вяселляў сваякоў быў фатограф, які асобна здымаў усіх гасцей. А пасля прапаноўваў ім здымкі за дадатковыя грошы, у раздрукаваным выглядзе. Памятаю, я крыху абуралася яго паводзінамі — маўляў, і так нямала атрымае за вясельную здымку ад маладых, а тут яшчэ хоча падзарабіць! Набыць тры свае карткі памерамі 15x21 ён мяне ледзь угаварыў. І... з прыгожай прычоскай, у святочнай сукенцы, з усмешкай на твары і добрым настроем, я дагэтуль вельмі люблю сябе на тых здымках. Яны доўга віселі ў маім пакоі ў рамачках і выклікалі захапленне гасцей. Адзін з тых здымкаў, зроблены ў стылі рэтра, адсканаваны, упрыгожваў не адну маю публікацыю вершаў у часопісах. Папера — надзейная. Рукапісы не гараць — аднак і папяровыя здымкі, як бачна, жывуць нашмат даўжэй за сваіх віртуальных сародзічаў.

У дзяцінстве, прыязджаючы ў вёску, я любіла гартаць старыя сямейныя фотаальбомы. Разглядваеш твары сваякоў. Часам памыляешся, адгадваючы, дзе маленькая мама, а дзе яе брат. Пра некаторых людзей на картках даводзіцца распытваць — хто гэта?.. Так даведваешся, як выглядалі родзічы. Прыкмячаеш для сябе некаторыя дэталі. Цікава глядзець на карткі, зробленыя ў квітнеючым садзе, побач з пуняй, якой ужо даўно няма і якой я ніколі не бачыла, хоць з маленства часта бывала ў тым двары. Праз старыя здымкі лепей разумееш сям'ю, больш яскрава адчуваеш тую неразрыўную ніточку, што вас яднае.

З такім жа імпэтам мы разглядвалі хіба што старыя вінілавыя пласцінкі, якія ляжалі там жа, дзе і альбомы — наверсе вялікай «новай» шафы. Прыемна было іх нават кранаць, не тое што слухаць. На старым прайгравальніку, які і без таго «хрыпеў», гучаў нізкі голас Уладзіміра Высоцкага. Часам ажывалі і пачыналі з намі размаўляць «Бітлы», Людміла Зыкіна, некаторыя класічныя кампазітары ахвотна дзяліліся прыдуманым.

Аднойчы, цёплым летнім вечарам, мы выйшлі ў поле, якое вядзе да смецевых ям. Запускалі старыя пласцінкі ў паветра. І яны ляцелі, як круглыя чорныя лятальныя апараты (бы ў папулярнай сёння гульні фрысбі). Падымалі з крыху пажоўклай травы пласцінкі і зноў запускалі іх у бок сонца, гледзячы на залатыя промні, што роўнымі празрыстымі хвалямі запаўнялі вечаровую прастору. Было прыгожа. Весела. І так да самых смецевых ям.

Наўрад ці мы б самі, дзеці, даўмеліся выкідаць нешта з дому. Хутчэй дарослыя вырашылі, што трэба крыху падчысціць «хлам» і загадалі малым выкінуць вінілавыя пласцінкі. Добра, што альбомы засталіся некранутымі! Частка пласцінак яшчэ ляжала на шафе. Бабуля кажа, што неяк прыходзіў адзін чалавек, заўважыў іх, папрасіў аддаць. Яна згадзілася. Так мы засталіся зусім без пласцінак — нібы без знаёмых галасоў у роднай хаце. А прайгравальнік стаіць і па сённяшні дзень. Маўчыць. Сумуе.



Нешта падобнае адбываецца з нашай памяццю. Некаторыя рэчы падаюцца няважнымі, нязначнымі. Мы часам блытаемся, думаем, што гэта хлам, выкідаем. Не лічым патрэбным пакласці ў бяспечнае месца.

Памяць пра мінулае сыходзіць са старэйшымі членамі сям'і, калі яны накіроўваюцца ў вечнасць, не пакінуўшы ўспамінаў. І ўжо не пазнаць твараў на старых фотаздымках. Бадай ніколі... Хіба што выпадак дапаможа. Неяк я па пільнай справе трапіла да стрыечнай бабулі ў Мінску, у якой ніколі не была дагэтуль. Селі кавы папіць, разгаварыліся... Я пачала распытваць пра сям'ю яе роднай сястры (маёй бабулі па бацькавай лініі, што ўжо памерла). Так шмат новага даведалася! І тое, што ў прадзеда было прозвішча Багушэвіч, і што вучыўся ён у духоўнай семінарыі, і скончыў яе на выдатна. І што сама бабуля хацела развесціся з дзедам, але не зрабіла гэтага... Мяне чамусьці напалохала сама думка пра тое, што блізкія людзі маглі развесціся.

Псіхолагі кажуць, што, калі ты даведваешся пра моцныя рысы сваіх продкаў, ты і сам робішся мацнейшым. Напрыклад ведаеш, што твая бабуля ўмее адначасова рабіць пяць спраў і ўсё паспявае пры гэтым — разумееш, што і табе пад сілу «разруліць» шмат чаго адразу. Бо твайму роду гэта не цяжка! Ці чуеш, што дзед усё жыццё марыў стаць артыстам, ды так і не здзейсніў задуманага... Пачынаеш разумець, адкуль у цябе схільнасць да публічных выступленняў. І больш не саромеешся гэтага. Хутчэй наадварот, адчуваеш сябе пакліканым выкарыстаць патэнцыял, які мае сям'я. Моцныя рысы сямейнікаў — гэта рэсурс, які варта выкарыстоўваць! Толькі трэба ведаць пра яго.

Мой тата не любіць пазіраваць на фотаздымках, якія я раблю, бо іх вельмі рэдка раздрукоўваю. Фотавыявы так і застаюцца ў пэўным сэнсе недасяжнымі, нават неіснуючымі. Колькі разоў я сабе нагадвала, што пара пайсці і зрабіць сямейны альбом. Рэальны, папяровы — выбраць нешта з тых гігабайтаў картачак, што захоўваюцца ў электронным выглядзе. Камп'ютар можа аднойчы зламацца ці яго прададуць — у спешцы многае не захаваецца. А папяровы сямейны альбом ні я, ні нашчадкі не выкінуць. Рука не падымецца...

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** nina@zviazda.by

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона по продаже недвижимого имущества, находящегося в частной собственности

Организатор аукциона: Открытое акционерное общество «Рембыттехника», г. Гомель, ул. Федосеенко, 4, конт. тел. (0232) 60 21 60.
Аукцион состоится 29 сентября 2017 года в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Федосеенко, 4, актовый зал.

На аукцион по продаже одним лотом выставляется:

| | |
|---|---|
| **Сведения о предмете аукциона** | Нежилые изолированные помещения №№ 1, 3, 4 по ул. Суркова, 5-1, 5-3, 5-4 |
| **Место нахождения предмета аукциона** | Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул, Суркова, 5-1, 5-3, 5-4 |
| **Начальная цена предмета аукциона** | 133 440,00 руб. (в т.ч. НДС по ставке 20%) |
| **Размер задатка, срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета** | 13344,00 руб. до подачи заявления на участие в аукционе вносится на р/с BY55BLBB30120400093609001001 дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, г. Гомель, ул. Советская, 7, БИК BLBBBY2X УНН 400093609 ОАО «Рембыттехника», **назначение платежа – задаток для участия в аукционе** |
| **Продавец предмета аукциона** | Открытое акционерное общество «Рембыттехника», 246028, г. Гомель, ул. Федосеенко, 4, конт. тел. 8 (0232) 60 21 60. Осмотр объекта на местности участниками аукциона производится по рабочим дням с 8.30 до 17.00 с участием представителя продавца: Зайцев Игорь Иванович, конт. тел. (0232) 60 22 98 |
| **Информация о земельном участке** | Земельный участок площадью 0,0758 га (доля 59/100) под застройкой с кадастровым номером 322350100002000748<br>- земельный участок для обслуживания здания на общем долевом праве постоянного пользования;<br>- переход права на земельный участок осуществляется победителю аукциона (единственному участнику несостоявшегося аукциона) в соответствии с действующим законодательством;<br>- имеются ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах линий связи и радиофикации, площадь 0,0026 га |
| **Характеристика предмета аукциона** | В состав имущества входит:<br>1) нежилое изолированное помещение №1 (помещение мастерской по ремонту бытовой техники), инв. №333/D-13032, назначение: помещение бытового обслуживания населения; расположено в одноэтажном кирпичном здании, 1978 г. постройки, общая площадь 67,9 кв. м;<br>2) нежилое изолированное помещение №3 (нежилое помещение), инв. № 333/D-37080, назначение: помещение бытового обслуживания населения; расположено в одноэтажном кирпичном здании, 1978 г. постройки, общая площадь 141,4 кв. м;<br>3) нежилое изолированное помещение № 4 (нежилое помещение), инв. № 333/D-37100, назначение: помещение бытового обслуживания населения; расположено в одноэтажном кирпичном здании, 1978 г. постройки, общая площадь 65,5 кв. м |

Порядок проведения аукциона определен ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь, а также Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов, находящихся в собственности ОАО «Рембыттехника».

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу:** 246028, г. Гомель, ул. Федосеенко, 4, приемная директора, **по рабочим дням с 8.00 до 12.00 и с 13.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 26 сентября 2017 г. до 16.00.**

**К участию в аукционе допускаются:** юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также предоставившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, документ, удостоверяющий личность (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в срок не позднее **10 (десяти)** календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **10 (десяти)** рабочих дней с момента подписания протокола. Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем, будет учтен в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или на аукцион явился один из участников (далее – претендент на покупку), предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов

---

Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» сообщает о внесении изменения в графу 7 таблицы извещения о проведении 12 сентября 2017 года открытого аукциона с условиями №09-У-17 на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) (опубликовано в газете «Звязда» от 10.08.2017):

- цифры «42 777,22» заменяются цифрами «40 350,02».

**Телефон для справок +375 (17) 226 16 72.**
**Адрес в сети интернет: www.mgcn.by** УНП 190398583

---

## ОАО «Дзержинский экспериментально-механический завод»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС, руб. РБ | Сумма задатка (10% от первоначальной цены) с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1. | **Установка воздушно-плазменной и газокислородной резки Vanad Proxima 20/60, 2008 г. в., заводской №908, инв. № 3249, в том числе:** | 43 980,00 | 4 398 |
| 1.1 | **Источник тока плазменной резки Kjellberg Finsterwalde (Германия) FineFocus 450** | 4 030,00 | 403 |
| | Итого: | 43 980,00 | 4 398 |

Задаток в размере 10% от начальной цены перечисляется на р/с BY58OLMP30121000155410000933 в ОАО «Белгазпромбанк» г. Минск, ул. Притыцкого 60/2, код банка OLMPBY2X, МФО 153001742, УНП 600004946, ОКПО 05550337.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Аукцион состоится 29 сентября 2017 г. в 14.00 по адресу: Минская обл., г. Дзержинск, ул. Фоминых, 46. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 25 сентября 2017 г. до 12.00 по указанному адресу.

**Контактные телефоны: 8 (044) 554-44-85, 8 (01716) 5-51-36, 5-69-24, тел./факс 5-52-79**

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62.
**Продавец:** ОАО «Витебские продукты», 210041, г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, 25, тел. +375 29 711-18-95

**Лот №1**. Капитальное строение с инв. №200/С-53085 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Терешковой, д. 14А, площадью 957,5 кв. м, наименование: здание магазина, расположенное на земельном участке с кадастровым №240100000001000491 площадью 0,1972 га; капитальное строение с инв. №200/С-96572 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул.Терешковой, хозяйственно-бытовая канализационная сеть от здания 14А, протяженность – 64,8 метра, наименование: хозяйственно-бытовая канализационная сеть. **Начальная цена:** 642 608,65 руб. без НДС. **Задаток:** 64 260, 87 руб.

Аукцион состоится 29.09.2017 в 11.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 29.08.2017 с 8.30 по 28.09.2017 до 17.30. Срок заключения договора купли-продажи: 10 календарных дней со дня проведения аукциона. **Условие аукциона:** оплатить предмет аукциона в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи, оплатить НДС сверх цены продажи объекта, возместить затраты на организацию и проведение аукциона и затраты по оценке имущества

**Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 №609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия. **Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан**: перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, возместить затраты по оценке имущества на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. **Задаток перечисляется на р/с BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, IBAN MTBKBY22, УНП 390477566, Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона.

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.**

---

## Извещение о проведении 11 сентября 2017 года повторных торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ №5» (пристроенный магазин с инженерными сетями)

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, отдельные характеристики, местонахождение продаваемого имущества)** | Незавершенное законсервированное капитальное строение, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 4Б, общей площадью 1959,6 кв. м (инв. номер в ЕГРНИ: 500/U-64983; наименование: незавершенное законсервированное капитальное строение; назначение: здание неустановленного назначения) |
| **Продавец имущества** | ОАО «ДСТ №5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253 |
| **Организатор торгов** | государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10 |
| **Начальная цена предмета торгов с учетом НДС** | 1 285 200,00 бел. руб. |
| **Сумма задатка** | 128 000,00 бел. руб. |

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ №5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», 220035, г. Минск, пр. Машерова, 80, БИК BPSBBY2X, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (покупатель) обязуется в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукционных торгов возместить организатору торгов затраты за организацию и проведение аукциона. Информация о сумме затрат за организацию и проведение аукциона, подлежащих возмещению, доводится до сведения участников перед началом аукциона при заключительной регистрации.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы затрат за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся 11 сентября 2017 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 29.08.2017 по 08.09.2017 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(024) 970-96-06; (029) 602-33-12 (ОАО «ДСТ №5»)**

---

БАНК РЕШЕНИЕ

## Уважаемые вкладчики ЗАО «Банк «Решение»!

Информируем вас о том, что с **29 сентября 2017 г.** по действующим вкладам (депозитам) физических лиц в белорусских рублях будут действовать новые условия в соответствии с приведенной ниже таблицей:

| Наименование вклада | Действующая ставка, % год | Новый размер ставки, % год | По договорам, заключенным |
|---|---|---|---|
| Белорусские рубли | | | |
| «Формула успеха» 7 мес. | 12 | 10,5 | с 10.11.2016 до 17.05.2017 |
| «Формула успеха» 1 год | 12 | 11,5 | с 09.06.2016 до 19.07.2017 |
| | 12,5 | | |
| | 13 | | |
| «Online-решение» 6 мес. | 12 | 10,5 | с 14.03.2017 до 14.06.2017 |
